**Віктар Шніп**

# Беларускае мора

Паэзія

Мінск
“Мастацкая літаратура”
2004

## БЕЛАРУСКАЕ МОРА

Залатымі манетамі зорак
Зноўку свеціцца неба над намі.
Неба ў нас — беларускае мора
З белакрылымі ў ім караблямі.

Адабраць у нас мора хацелі,
Наша мора адзінае ў свеце,
Каб на мора мы больш не глядзелі
І жылі па лясах, як мядзведзі.

Мы ў вяках збераглі сваё мора,
І нас мора ад бед зберагае,
Залатымі манетамі зорак
Уначы яно нас абсыпае.

З мора нашага нехта смяецца,
Але мора ў нас ёсць, як і ўчора.
Маё цела зямлі застанецца,
А душа — пераселіцца ў мора.

**1**

## ПОЛАЦКАЯ БАЛАДА

Нам вяртацца ў святло старажытнай зямлі,
Каб пра нас не сказалі, што мы аджылі,
Адспявалі, адплакалі долю сваю
І згубілі, як вечнасць, як волю, зямлю,
На якой нашы вежы, як свечкі, стаяць,
На якую з нябёсаў анёлы глядзяць —
І ўсё бачаць: куды і адкуль мы ідзём
І хто з хлебам і соллю, хто з чорным агнём…
Праз туман, што кудзеліцца над Палатой,
Час ляціць, быццам смерць за варожай гайнёй,
Праз цябе, праз мяне і праз тыя гады,
Пра якія не знаем ні я і ні ты,
Бо вяртаемся мы, як вяртаецца дзень.
Перад намі святло, а за намі наш цень,
Нібы крыж, нібы крык, што жылі і жывём

І вяртаемся мы да сябе, у свой Дом,
Ад якога нікуды з табой не ўцяклі…

Мы, як вежы, стаім на бацькоўскай зямлі…

## БАЛАДА МІРСКАГА ЗАМКА

У Мірскім замку сёння светла,
У Мірскім замку сёння лета,
І лёт стралы, як лёд, растаў,
Бо замак сонечна паўстаў
На скрыжаванні ўсіх шляхоў,
На скрыжаванні ўсіх вятроў
У гэтым свеце, дзе ёсць мы
І нашы родныя дамы,
З якіх глядзім і бачым свет,
Які любіць нам і стварaць,
Нібыта замак будаваць
Сярод шляхоў, сярод вятроў,
Сярод разбураных муроў,
Што баранілі нас, каб мы
Сярод агню, сярод зімы
Свой мелі шлях, свой мелі сцяг
І роду слаўнага працяг
На скрыжаванні ўсіх шляхоў,
На скрыжаванні ўсіх вятроў,
Як Мірскі замак, не знікаў.
І часу лёт, як лёд, сцякаў
На гэты край жывой вадой,
Каб мы сустрэліся з табой
У Мірскім замку ў гэты час,
Які стралой ляціць праз нас…

## БАЛАДА КНІГІ

На кнігах старадаўніх на гарышчы
Змярцвелы пыл парушыў ты, як сцены
Турмы,
	і вецер волны вольна свішча,

І ты,
як слупам пыл устаў,
з каленяў
Устаў
і ўбачыў раптам прад сабою
Людзей, што не дайшлі да Беларусі.
Ты шмат хацеў сказаць прад грамадою,
Але сказаў адно: «За вас малюся...»
І зніклі людзі, як святло знікае,
Ды ў кнігах, быццам бы вугалле, словы
Святлом успыхнулі.
Святло сцякае
На нашы цёмныя, як ноч, галовы
З нябёс, нібыта з кнігі нашых лёсаў,
Якіх нікому не змяніць ніколі.
Мы вечна ўсе залежым ад нябёсаў,
Нібы ад ветру пыл у чыстым полі...
Але ты з кнігі пыл абтрос, і кніга
Зноў ажыла, і ажыло былое,
Нібы з трубы прарвалася Няміга
І Слова вынесла з зямлі святое...

## БАЛАДА КРЭЎСКАГА ЗАМКА

Травой заплываюць ссівелыя сцены,
Нібы карабель адыходзіць на дно
Зялёнага мора, дзе кветкі, як пена,
Дзе птушкі анёламі лётаюць зноў
Над нашым гарыстым, як хвалі, прасторам,
Дзе жыць яшчэ хочам і не сумаваць
І выплыць спрабуем, як з мора, з Учора,
З якога не будзе каму ратаваць
Мяне і цябе, калі мы не ўратуем
І гэтыя сцены, і гэтую ціш,
Што сонца, сыходзячы ў цемру, цалуе,
І, як на ікону, на іх ты глядзіш,
Ікону, якую даўно растапталі
Не людзі чужыя, а нашы, свае,
Што долі, знішчаючы долю, шукалі,
Якім і сягоння чагось не стае

Ля гэтых травою затопленых сценаў,
На гэтай крывёю палітай зямлі,
Дзе мы ўсё чакаем з табой пераменаў
Заместа таго, каб тут жыць, як жылі
Тутэйшыя людзі, што славілі Бога
І славу сабе здабывалі жыццём...
Да Крэўскага замка травее дарога,
Па гэтай дарозе яшчэ мы ідзём
І будзем ісці, як з нябыту вяртацца,
І бачыць дарогу і сонца над ёй.
Хтось будзе — над намі зласліва смяяцца,
Хтось будзе — спагаднай свяціцца слязой...

## БАЛАДА ВЯРТАННЯ БАГДАНОВІЧА

Максім Багдановіч... Максім,
Самотны, нібы пілігрым,
Які хоць вярнуўся дамоў,
А дома свайго не знайшоў,
Як нельга магіл адшукаць,
Дзе рыцары нашы ляжаць...
Максім Багдановіч... Максім,
Мы разам з табою ляцім
Да зорак, што светла гараць
У небе, куды не глядзяць
Самотныя людзі з акон,
Счарнелых, як лікі з ікон...
Максім Багдановіч... Максім,
Жыццё наша сёння як дым,
З якога не бачна жыцця,
Нібыта не бачна лісця
На дрэвах, што ссохлі вясной,
Калі развітацца з табой
Нам дадзена лёсам было...
Але не прапала святло,
Якое ты нам запаліў
На гэтай прыгожай зямлі,
Дзе мы спаконвеку былі
І будзем, як гэты прастор,
Як гэта імкненне да зор...

Максім Багдановіч... Максім...

## БАЛАДА УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Ён паехаў на Прыпяць памерці.
Там у чоўне, як ліст у канверце,
Што напісаны Богам для Бога,
Ён па Прыпяці плыў, як па Леце,
І была блаславёнай дарога.
Трапятаў за ім восеньскі вецер,
Нібы сцяг, што над вежай узняты,
Нібы дым, што над комінам хаты,
Дзе ніхто ўжо даўно не бывае,
Куды смерць нават не зазірае.

Ён паехаў на Прыпяць памерці,
Нібы слёзы п’яныя расцерці,
І сказаць, што жыццё як вадзіца,
У якой рана-позна ўтапіцца
Давядзецца ўсім, хто нарадзіўся,
Хто маліўся — і хто не маліўся.
Човен плыў, і глядзелі ўслед людзі,
І знікалі, як крыгі вясною,
А ён быў, а ён ёсць, а ён будзе,
Быццам неба над белай зямлёю,
Дзе ёсць Прыпяць, дзе можна памерці,
Каб у чоўне, як ліст у канверце,
Што напісаны Богам для Бога,
Плысці вольна і думаць дарогай
Пра мяне — і хлапца маладога,
Што яшчэ анічога не знае,
Але ўжо, як паэт, выпівае
І гаворыць, што можа памерці,
Быццам бы малако з вуснаў сцерці,
І памерці ў любую хвіліну,
Ды з гарэлкі, а не за Айчыну...
Ён паехаў на Прыпяць, каб жыць,
Каб мяне з табой — не разлюбіць,
Быццам неба — над белай зямлёю,
Быццам сцяг — па-над вежай старою...

## БАЛАДА МАКСІМА ТАНКА

У Максіма была, як няволя, Радзіма,
Але тая няволя любіла Максіма,
А Максім нарачанскія сосны любіў,
Быццам гліну, з якой гэты свет нам зляпіў
Наш Пан Бог, для якога сягоння ўсе мы
Як праталіны ў снезе сусветнай зімы…

Ад Максіма для нас засталася Радзіма,
Без якой аніхто тут не ўспомніць Максіма…

## МАГЧЫМАЯ БАЛАДА XXI СТАГОДДЗЯ

Ты будзеш салдатам, якога заб'юць,
Пакуль самагонку смярдзючую п'юць
Браты твае большыя, што застануцца
У вёсцы аціхлай, дзе ў трунах смяюцца
Хлапцы маладыя, што шчасця не зналі,
Пакуль яго ў свеце здзічэлым шукалі...

Ты будзеш салдатам, ты будзеш героем,
І будуць дзяўчаты ісці за табою,
І кветкі, і слёзы, і сцяг на труне...
Ты будзеш салдатам на вечнай вайне,
Якая прыдумана ўчора не намі...
Бярозы не хочуць рабіцца крыжамі,
Бярозам ахвота зімою гарэць
У печы —
і плечы старэчыя грэць.

Ты будзеш салдатам, мой хлопчык-сусед,
А мог бы з цябе атрымацца паэт.
Ды сёння паэтаў нікому не трэба.
Над светам, як саван, зніжэлае неба...

Ты будзеш салдатам апошняй вайны,
І я плакаць буду ля чорнай труны,
І ты мне ўсміхнешся, пазнаўшы мяне,
Бо ты шчаслівейшы, бо ты — у труне.

Мяне ж тут — ці будзе каму закапаць?..

Над светам жалезныя птушкі ляцяць,
І неба чарнее, нібыта згарае,
І чорнае сонца ўзыходзіць над краем...

## БАЛАДА ПАЛАНЕЗА АГІНСКАГА

Вена і Венецыя, Парыж
І стары каля дарогі крыж,
На якім распяты родны край,
Поўняць вочы, поўняць небакрай
Смуткам, бо жыццё, як паланез,
Прагучыць — і ў вечнасць адплыве,
Як туману непраглядны лес
Знікне, бы ў пажары, у траве,
Што расце, не знаючы, што зноў
Замяцецца цішынёй снягоў,
Светлых, быццам музыка ўначы,
Што ў травінцы кожнае гучыць
У Залессі, дзе жыццё ідзе,
Як Хрыстос, спакойна, па вадзе,
Па людзях, якім ахвота — цуд
І якім нямілы родны кут,
Вена і Венецыя, Парыж,
І стары каля дарогі крыж,
І валун у полі, на якім
Мы з табой, як груганы, сядзім...
І Агінскі грае паланез
Пра дарогу, пра крыжы, пра лес
І пра лёс, які чакае нас,
І ляціць, нібыта знічка, час.
І Радзіма, як агонь,— святлей,
І Радзіма, нібы дым,— гарчэй,
І стары, каля дарогі, крыж,
На які, як на Хрыста, глядзіш —
Сустракае і праводзіць зноў
У той свет, дзе ёсць яшчэ Любоў...

## БАЛАДА ВАСІЛЯ БЫКАВА

Ён вярнуўся дамоў не памерці,
А спазнаныя словы сказаць,
Што няма і не будзе нам смерці —
І не трэба па ім сумаваць,
Як па хмарах дажджы не сумуюць,
А ідуць, нібы вечнасць, дажджы,
За якімі ўсе душы начуюць,
Покуль мы не адчуем душы
У сваім аграхоўленым целе,
Што як сон, да якога ісці
Па дарозе, не ўсім зразумелай,
Як агню — па апалым лісці…
Ён вярнуўся дамоў, каб не ўмерці,
Як вяртаюцца ў неба дажджы,
Бо няма нараджэння і смерці,
Як Хрыста ўжо няма на крыжы…
11.6.2003

## БАЛАДА ПРА ЦАРКВУ І ВАЎКА

Там, дзе з неба падала вуголле,—
Шапаціць былінная трава,
І высокая, як дым, царква
Светлы цень кідае ў наваколле.

І прыходзяць да царквы сляпыя,
І вяртаецца няшчасным зрок,
І глядзіць на іх вялікі воўк
Праз гады і далечы начныя.

Гэты воўк сівы — мой брат старэйшы,
Вольны ён, а я — у ланцугах
Зноў пайду з слязамі на вачах
Да царквы старой прасіць аб лепшым.

Я вярнуся вечарам дахаты —
І мяне сустрэне воўк сівы,
Скажа: «Адрачыся ад царквы,

Будзеш зноўку малады й багаты...»

Не паспею адказаць нічога,
Бо застрэліць мой сусед ваўка,
І пральецца з-пад аблок рака,
І царква сплыве назад да Бога.

І каб гэтак не было ніколі,
Не пайду я сёння да царквы,
Буду слухаць сумны шум травы,
Як выццё ваўка у шэрым полі...

## БАЛАДА ЧАКАННЯ

Хутка восень надыдзе, а там і зіма,
А цябе ўсё няма, а цябе ўсё няма.
І снягамі сады і сляды замяце,
І рака сінім лёдам за ноч зацвіце,
І асветліцца неба, і абудзіцца дзень,
І ўзляціць, як груган, нада мною мой цень,
І ён знойдзе цябе, як знаходзіць святло
Адзінокі сляпы, што ідзе праз сяло,
Што ідзе і не знае, што хутка зіма,
А цябе ўсё няма, а цябе ўсё няма.
І яму пра цябе, як пра дзень, раскажу,
Быццам бы адпушчу да анёлаў душу...
Хутка восень надыдзе, а там і зіма,
І зіма, можа, будзе нібыта турма,
І таму не спяшайся вяртацца дамоў.
Я таксама, напэўна, адсюль бы сышоў,
Каб табе не сказаў, што век буду чакаць,
Быццам Храм для дваіх на гары будаваць...

## БАЛАДА ПЕРШАГА БЕЛАРУСКАГА ВАНДРОЎНІКА

...На сонцы нежывым вісяць нябёсы,
Нібы на залатым цвіку карціна,
Дзе воблакі, як белыя бярозы,

Плывуць адтуль, дзе ёсць твая Айчына.
А дзе Айчына ёсць, там ёсць надзея
На светлае, на роднае, жывое,
Якое ў лютую зіму сагрэе
І шлях падкажа з далечы чужое.
І ты глядзіш на воблакі з Айчыны,
Нібы глядзіш на ручнікі Алёны,
Што па рацэ праз дальнія краіны
Плывуць спакойна ў акіян сцюдзёны.
І тут, ля белых хваляў акіяна,
Якія ліжуць, быццам лёд, нябёсы,—
Цячэ твой шлях, спакон наканаваны,
Як па шчацэ Хрыста сляпыя слёзы...

## БАЛАДА ПОШУКАЎ СВАЙГО СВЕТУ

...І ён штовечар свой знаходзіў свет,
Нібы сабака чалавечы след
Сярод слядоў звярыных у траве.
Свой свет знаходзіў у старой царкве
Каля спакою пыльнага ікон,
Ля свечак, нібы залатых калон
У райскім садзе, дзе ніколі нам
Не быць, бо век не збудаваць свой Храм
З тых сноў, якімі поўніцца прастор,
Кудой мы ўсе ляцім да сумных зор.
А ён штовечар свой знаходзіў свет,
Нібыта рыфму малады паэт
Да слова неспазнанага «люблю»,
І па радках, як па прыступках, кроў
Цякла і размывала гэты свет,
Дзе, як сабака чалавечы след,
Штовечар ён адзін свой свет шукаў,
Пакуль на сцежцы ля царквы не ўпаў.
І зашумела па-над ім трава,
І знікла ў небе, як душа, царква...

## БАЛАДА ЗАМКА Ў ЛОСКУ

Валянціне Гіруць-Русакевіч

На замчышчы высокім сёння ў Лоску
Трава зжаўцелая, нібыта з воску.
І замчышча як свечка, што згарае,
Але ў вяках, як шлях наш, не знікае,
Бо мы тут ёсць, былі і будзем вечна
Ля нашых свечак, што пад Шляхам Млечным
Гарэць, як мы, не маючы спатолі…
І вецер, быццам конніца, у полі
Ляціць і разбіваецца аб вежы,
І пыл стагодні ў неба дымам свежым
Плыве і ўжо ля зорак застывае,
Нібыта воску рэчка залатая
На замчышчы высокім сёння ў Лоску.
На замчышчы стаім, глядзім на вёску.
Нібыта з неба, з замчышча глядзім,
Дзе мы як дым. Але не ўсё як дым,
Бо шлях дамоў і родныя дамы
Заўсёды ёсць і будуць, як і мы,
Як замчышча высокае, што ў Лоску,
Дзе сёння травы жоўтыя, як з воску…

## БАЛАДА ПЕРШАГА СНЕГУ

Першы снег як спаленыя вершы,
Што, пабыўшы дымам, на зямлю
Зноўку прыляцелі снегам першым,
Каб пачуць самотнае «люблю»,
Што не сказана было спачатку
Вершам тым, што прагнаму агню
Кінуты, бы кінута пальчатка
У гарачы твар сівому дню…

Першы снег, ты зноўку не пачуеш,
Што цябе люблю, як боскі верш,
Што ўва мне зіму перазімуе
І мяне, як снег, перажыве,

Не пачуўшы цёплых слоў ніколі,
Слоў, што, пакідаючы зямлю,
Будуць лётаць, як буслы над полем,
І шукаць, як важака, «люблю»...

## БАЛАДА XX СТАГОДДЗЯ

Памяці бабулі Ганны

Дагаралі ціха свечкі ў Храме,
Раскуплялася гарэлка ў краме...
Толькі не канчалася жыццё,
Што ляцела, як ляціць лісцё
Восеннюю ў калюгі і ў балота.
І пра рай гарланіла басота,
Што аж чэрцям весела было,
І знікала боскае святло,
І на Храмах выраслі травы,
І мярзотнікі шукалі славы...
Ну а ты хацела быць святой,
Як святло над спаленай царквой,
Як ікона, што з агню дасталі
І забыліся, куды схавалі...
Час прыйшоў, і ты ў труне ляжыш,
Як паваленый на травы крыж.
І стаім мы ціха над табою,
Нібы дым над спаленай царквою.

## БАЛАДА ДВАІХ

Сцішэла ўсё наўкол, нібы памёрла,
І сонца, як разрэзанае горла,
Афарбавала чырванню азёры,
Дзе рыба засвяцілася, як зоры,
Што ноччу падалі, нібыта росы
З высокай беларускае бярозы...

Заціхла ўсё і зноўку ажыло,
І сонца, нібы ружа, зацвіло
І асвяціла возера глыбіні,

Дзе рыба, як пралітае святло,
Плыве і ў адзіноце соннай стыне...

Яны на сонца ранняе глядзелі
І гэты свет па-свойму разумелі,
Дзе цішыня, нібыта ўсё памёрла,
І сонца, як разрэзанае горла...
І сонца, нібы ружа, зацвітала...

І вой маўчаў, і паннaчка маўчала.

## БАЛАДА ЎЦЁКАЎ З КАРЧМЫ

Там, дзе вада затапіла шырокія нашы палі,
З неба чарнюткага ўпала бялюткая птушка ў ваду.
Мы, што забыліся Бога, сядзелі ў карчме і пілі,
Мы прапілі ўжо сябе, і маглі б мы прапіць і бяду.

Птушка ваду асвятліла сваёю гарачай крывёй,
Нашы палі задрыжэлі, каменне цяжкое ўсплыло.
Гром загрымеў над маёю дурной,
як жыццё, галавой,
Хлынула з куфляў паўнюткіх
да столі чарнюткай святло.

Трэснула столь,
і разбегліся мышы з гарышча ўначы,
Выбег і я, нібы мыш,
што абсмалена злым карчмаром.
Боль невыносны,
хоць вый, хоць ты крычма да Бога крычы,
Дзёр мне вантробы
і смажыў пякельным бязбожным агнём.

Як звар’яцелы,
ляцеў я праз пекла людскога жыцця,
Каб ратаваць ад патопу дамы і магілы дзядоў.
Падаў на золата, падаў на гідкія кучы смяцця,
І закіпала ўва мне, як віно, невясёлая кроў.

Толькі ўсё ж там, дзе вада, нібы ноч,
затапіла палі,
Быццам бы зоркі ў нябёсах,
па хвалях каменне плыло.
...Мы, што з карчмы паўцякалі,
на слізкіх каменнях плылі,
З чорнай вады нам свяціла бялюткае птушкі крыло.

## БАЛАДА РАЗВІТАННЯ

Трымаецца неба на зорках,
Нібы на іржавых цвіках.
І ты, нібы Гарсія Лорка,
Сумуеш па доўгіх начах,
Якія ты ў вершы складаеш,
Нібыта збіраеш букет
Дзяўчыне, якую кахаеш,
Якая прамовіла: «Нет...»

Далёка, як Афрыка, мора,
Як неба, як зоркі ў акне.
Далёка, як тое, што ўчора
Было нібы сонца ў віне.
Вярнуцца назад немагчыма,
Нібыта згарэць і ажыць,
Бо вечная толькі Радзіма
І кроў на ахвярным крыжы...

## БАЛАДА ВЯРТАННЯ

Я сягоння ў дзяцінства вярнуцца жадаю,
Не таму, што там добра малому было,
А таму, што па сцежках бацькоўскага краю
З хаты ў хату цякло Беларусі святло,
Ад якога святлелі самотныя хаты,
І хацелася быць, і хацелася жыць,
І спявалі ля рэчкі пра Яся дзяўчаты,
І пускалі вянкі, і хацелася плыць
За вянкамі ў нязведаны свет за лясамі,

Не таму, што там добра, напэўна, было,
А таму, што дабрэйшымі мы былі самі
І па сцежках цякло Беларусі святло,
Ад якога святлелі самотныя хаты...
І мне хочацца быць, і мне хочацца жыць,
Бо яшчэ хоць цішэй, ды спяваюць дзяўчаты
І ў нябёсах высокіх белы бусел ляціць.
Я сягоння ў дзяцінства вярнуцца жадаю,
Не таму, каб там жыць, а каб дзеду сказаць,
Што няма ўжо даўно таго сумнага краю,
За які ён хадзіў два разы ваяваць...

## БАЛАДА ЗАМЕРЗЛАЙ РЭЧКІ

Бурлівая рэчка замерзла,
і б'еццца-трапечацца рыба аб лёд,
Нібыта аб шыбу
з пажоўклай паперы
з дзяцінства майго самалёт.
А я пасівелы па беразе белым,
нібы па аблоках, іду,
І белая чайка ў нябёсах,
нібыта за шыбай, крычыць пра бяду,
Бо рэчка замерзла,
нібыта спыніўся нам Богам адведзены час,
І сонца патухла,
і хутка на свеце халодным не будзе і нас,
І толькі маўклівая рыба ўсё будзе тут біцца
і біцца аб лёд,
Нібыта аб шыбу
з паперы пажоўклай
з дзяцінства майго самалёт,
Нібыта агеньчык у полі,
спалоханы ветрам у ціхай начы,
Нібыта ў душы маёй сумнай
любімыя мною мае Пугачы
Заўсёды свяціцца ўва мне будуць светла,
пакуль я на свеце жыву,
Пакуль не забыўся сцяжыну ў старую,
як дзедава хата, царкву,

Хоць плыткая рэчка замерзла
і б'ецца-трапечацца рыба аб лёд,
Нібыта аб шыбу
з пажоўклай паперы
з дзяцінства майго самалёт.

## ПІРАЦКАЯ БАЛАДА

Няма даўно на караблі
Ні маракоў, ні капітана.
І не даплыць нам да зямлі,
І паміраць яшчэ нам рана,
Бо залатое ў нас руно,
Як наша смерць, пыліцца ў скрыні.
Яшчэ ў біклагах ёсць віно,
Нібы аазіс у пустыні,
І мы, як прывіды, плывём
Праз туманы, праз вецер, хмары.
Марской вадою, як агнём,
У нас апаленыя твары.
Нам вочы сонныя, як лёд,
Спакойна сонца раз'ядае.
Па ланцугах здзічэлы кот,
Як мы, сам па сабе гуляе.
І не ўратуе нас руно,
Якое болей нам не трэба,
Бо неба як марское дно
І дно марское быццам неба...

## БАЛАДА ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

Жыццё кароткае, як ноч, што забівае,
І вечнае, як верш, які з душы ўсплывае,
Як з неба зорка, да якой ісці
Па вострых травах, залатым лісці —
І быць сабой, як ластаўцы ў палёце,
Як водсвету агню на тонкім лёдзе,
Што ў лістападзе, як лязо нажа
Блішчыць, і, як матыль, імкне душа

Ягонай наталіцца адзінотай,
Нібы агонь — апалаю лістотай...
Жыццё, нібыта геніяльны верш,
Кароткае — і ў вершы ты жывеш,
Які ты нам, самотным, прысвячала,
Нібыта з неба зорку даставала,
Каб, без цябе застаўшыся адны,
Праз ноч змаглі дайсці мы да вясны,
Дзе зразумець, што ластаўка ў палёце
Як водсветы агню ў анёльскім лёдзе...

## БАЛАДА ВАСІЛЯ САХАРЧУКА

Цябе няма, але ты ёсць — адсутны
На час, які ўжо знаеш толькі ты.
Цяпер ты пэўны: ісціна і сутнасць —
Як у віне, у свеце нематы,
З якога не вяртаюцца дадому,
Каб расказаць, дзе быў і што рабіў,
Каб зразумелым стала тут любому,
Што ты жыццё больш за віно любіў...
Цябе няма, як нас няма ў тым свеце,
Якога мы не ведаем яшчэ.
Ты светам стаў, які самотна свеціць
У ціхае слязіне на шчацэ
У той адной, што сёння зразумела:
Цябе няма і ўжо не будзе тут,
Дзе пад крыжом тваё, як кокан, цела
Ляжыць, не помнячы зямных пакут,
З якіх душа ляпілася, як з гліны
Нябачнае нябачны той сасуд,
З якога п'е жыццё і сэнс Айчына
І кожнаму дае для шчасця кут...
Цябе няма, і хутка нас не будзе
На час, якога мы не знаем тут.
Не будзе нас, нібы віна ў сасудзе,
І будзе свет, як без віна сасуд...

БАЛАДА БЕЛЫХ ПТУШАК

Белыя птушкі лятаюць над намі,
Быццам анёлы ўначы над крыжамі,
Што на ўтравелых магілах стаяць.
Белыя птушкі, як белыя душы,
Белыя, быццам нябесныя ружы,
Што пад вятрамі ля зорак дрыжаць.

Ты мне гаворыш пра светлыя далі,
Быццам пра сонца, якога шукалі
Белыя птушкі на белай зямлі,
І не знайшлі, і ўзляцелі над намі,
Быццам малітвы, што выспелі ў Храме,
Дзе мы з табою, як птушкі, былі...

## 2

* * *

Нясмелыя цёплыя дні,
Нібыта ў цямноцці агні,
Шчэ свецяцца ў восеньскай плыні.

А лета нібы не было,
І ў рэчцы на хвалях святло
Няспешна сплывае і стыне.

На беразе моўчкі сядзім,
На рэчку начную глядзім,
Нібыта на нашую долю.

І ты мне гаворыш пра свет,
Нібыта мастак пра партрэт,
Якога не будзе ніколі...

* * *

Мы яшчэ маладыя з табой,
Быццам восеньскі лёд пад нагой

На калюзе, дзе зорка на дне,
Як святло ў адзінокім акне,
Да якога з табой мы ідзём
Ціхай ноччу і ветраным днём.
І смяюцца над намі вятры,
І ўначы ўслед крадуцца звяры,
Але мы, хоць няспешна, з табой
Пад нябёсамі, як пад вадой,
Без дарогі да мэты ідзём.
І асветліцца восень агнём,
І раструшчыцца восеньскі лёд,
Бы з нябёс упадзе самалёт,
У якім мы хацелі ляцець,
Каб на зоры чужыя глядзець,
Як глядзець на святлынь у акне,
Дзе ніхто не чакае мяне,
Дзе ніхто не чакае цябе —
І ніхто нам не скажа ў журбе:
«Мы яшчэ маладыя з табой,
Быццам восеньскі лёд пад нагой...»

* * *

Будзе снег. Будзе дождж. Будзем мы.
І не будзе самотнай зімы,
І не будзе забытых дарог,
І не будзе высокім парог,
За якім ёсць цяпло і святло,
За якім нас з табой не было,
Бо з табою самотныя мы,
Як высокія сцены турмы,
За якімі жыцця не відаць,
За якімі не душы сядзяць,
А знямоглыя цені людзей,
Што жадаюць памерці хутчэй,
Бо на вуліцы снег і вятры,
Бо далёка, як воля, сябры,
Бо на вуліцы дождж і святло,
Бо жыццё ўжо нібыта прайшло...

Ды не будзе самотнай зімы.

Будзе снег. Будзе дождж. Будзем мы.

## СПЁКА

Зноў спёка... І сонца, як д’ябалава вока,
Адно над прасторам зжаўцелым і намі,
І, быццам вуголле, у нас пад нагамі
Каменне, з якога народзіцца спёка
І пылам у неба ўзляціць і растане,
А можа, і зоркай маленькаю стане
І будзе свяціцца ўначы адзінока,
А ўдзень будзе спёка, а ўдзень будзе спёка,
І сонца зноў будзе як д’ябалава вока,
Якое ўсё бачыць — і бачыць далёка,
Далей, чым ісці нам сягоння з табою
У свет, дзе дажджы хаўрусуюць з травою
І травы растуць, нібы дождж, да аблокаў,
А ў небе аблокі высока-высока
Пад зоркай маленькай,
як кропляй з крыніцы,
З якой анікому цяпер не напіцца,
Бо сонца ў нябёсах, як д’ябалава вока,
І спёка...

* * *

Зноў за вокнамі ноч, як бяздонне
Адзінокай забытай ракі,
У якой патанулі мы сёння,
І не хутка са дна рыбакі
Чорнай сеткай дастануць на бераг
Нас усіх, што заціхлі даўно
І ў сваё ратаванне не вераць
І таму п’юць спакойна віно
І глядзяць на халодныя зоры,
Што, як воўчыя вочы, блішчаць
У чарнюткім, як сажа, прасторы,
Дзе анёлы, як дым, зноў ляцяць
У жывое, як рэчка, бяздонне,
У якое мы ціха глядзім

І не бачым, як плавіцца Сёння,
Быццам свечка, з якой белы дым
Адлятае, як наша дыханне,
І знікае, як наша віно,
У якім ёсць пачатак світання,
Пра якое мы плачам даўно...

* * *

Я люблю сяброў, што ўмеюць здрадзіць,
Быццам лёд на рэчцы веснавой
Праламацца, чорнаю вадой
Белы снег, нібы душу, запляміць
І застацца лёдам пад нагой.

Я люблю іх і з сябе дзіўлюся,
Быццам рэжу вены, ну а кроў
Не цячэ, як сцежка да сяброў,
Без якіх я сёння абыдуся
І не знікну дымам ад кастроў.

Я люблю, і гэта нават смешна,
Бы атруту з рук сяброўскіх п’ю,
Быццам неба, нібы шыбу, б’ю,
Каб даць волю думцы сумна-грэшнай
І прамовіць: «Я сяброў люблю...»

* * *

Пад тваімі вокнамі рабіна
Сумная, як нашая Айчына,
Сумная, бо хутка ўжо зіма.

І глядзіш ты на рабіну ветла,
Ад рабіны ў панадворку светла,
Ды чамусьці радасці няма.

Хутка ўжо сцямнее ў панадворку
І ў нябёсах Бог запаліць зорку,
І глядзець на зорку будзеш ты.

І ўрасце ў душу тваю рабіна,
Сумная, як нашая Айчына,
Светлая, як восенню лісты...

* * *

Шчаслівыя людзі, што ведаюць мала
Пра свет, у якім яны сёння жывуць.
Зноў зорка ў нябёсах ляцела — і ўпала,
На міг асвяціла нябёсы й траву.

Шчаслівыя людзі... Я з імі шчаслівы —
Гляджуся ў нябёсы і бачу ўначы
Не зоркі над намі, а спелыя нівы
І родную вёску сваю Пугачы.

Шчаслівыя людзі... І кожны — няшчасны,
І ў кожнага крыж свой, і ў кожнага шлях
Да крыжа свайго, як праз лес непралазны —
Праз лёс са слязамі на сумных вачах.

Шчаслівыя людзі... Як трэба тут мала
Для шчасця, якое прыйшло — і няма,
Як зорка ў нябёсах, што раптам упала,
На міг перакрэсліўшы слова «зіма».

Шчаслівыя людзі, што ведаюць многа
Пра свет, у якім яны сёння жывуць,
У Храм ідучы, зноў прыходзяць да Бога,
Які асвятляе нябёсы й траву...

* * *

Прыйшлі сябры і мне сказалі, што мяне
Яны ўжо прадалі па выгаднай цане
І засталося толькі вершы ўсе спаліць,
Каб можна ім было спакойна жыць.
І я ў адказ не змог нічога ім сказаць,
Але й не стаў ім раптам ногі цалаваць,
А выйшаў з хаты, быццам рэчка з берагоў,
І ў невядомы свет, нібы ў агонь, пайшоў.

І ўслед, як д’яблы, засмяяліся сябры,
Нібы каменне пакацілася з гары
Мне ўслед, і я спыніўся, быццам скамянеў,
І на сябе, нібы ў люстэрка, паглядзеў
І ўбачыў раптам, што мяне няма нідзе
І следам аніхто за мною не ідзе,
А там далёка, на высокае гары,
Стаяць, як помнікі, самотныя сябры,
Што ўчора прадалі па выгаднай цане
Сябе, а думалі, што прадалі мяне...

* * *

Беларусь не птушка, не шыпшына,
Беларусь — цяжарная жанчына,
У якой даўно сівыя дзеці
Параскіданы па белым свеце,
Як лісцё раскідана бярозы
Ветрам, што як Сыс той нецвярозы
Вершы кідае са сцэны ў залу,
Бы ў агонь, які гарыць памалу
Да пары да часу, бо так трэба,
Бо на ўсё глядзіць спакойна неба,
У якое рэдка мы глядзім,
У якое думкамі ляцім —
І вяртаемся назад, сюды,
Дзе вясною белыя сады
Чыстыя, наіўныя, як дзеці,
Што разыдуцца па белым свеце,
Зразумеўшы раптам, што яны
Тут не дачакаюцца вясны...
Беларусь не птушка, не шыпшына,
Беларусь — цяжарная жанчына...

* * *

Мы затоплены часам, нібыта вадой,
І ўжо нам паратунку даўно тут няма,
І нябёсы, як лёд, у нас над галавой
Заіскрацца ўначы, як настане зіма.

Толькі мы не баімся, што згубімся мы
У бялюткім прасторы нявечнай зімы,
Бо мы тут нарадзіліся, тут мы памром,
І труна паплыве, як апошні паром,
На той бераг, дзе вечна чакаюць крыжы
Нас усіх, адзінокіх, што хочуць пажыць
На затопленай часам самотнай зямлі,
Дзе вясковыя хаты, нібы караблі,
На якіх прыплылі мы ў нязведаны свет
Ад сваіх невядомых зямель і планет,
Што затоплены часам, нібыта вадой,
Дзе ратунку ўжо нам не было і няма,
І нябёсы, як лёд, у нас над галавой
Заіскрыліся ў ноч, як настала зіма...

* * *

Песні слухаю, і піва п’ю,
І жыццё вар’яцкае люблю,
Быццам любіць чорны пісталет
Малады наіўны інсургент,
Што загіне раніцай — і снег
Замяце яго, нібыта грэх
Замяце, і прыйдзе воўк стары,
І не вернуцца назад сябры...
І мне хопіць піва, каб слязой
Асвяціцца ў вечнасці начной,
І сябе хоць крыху зразумець,
І ў сябе, нібы ў агонь, глядзець,
Слухаць песні і ўцякаць з зімы,
Быццам інсургент — з турмы...

* * *

Людміле

Зноў далёка ля Чорнага мора
Белых чаек ты корміш з рукі.
А здаецца, было гэта ўчора,
Калі тут мы з табой ля ракі
Сустракалі вясну маладую,
Што на крыгах, як хмарах, плыла

І знікала ў далечу чужую,
Размываючы плынню святла
Бераг наш, дзе з табой мы стаялі,
І глядзелі адно на раку,
І, як неба начное, маўчалі,
І рука саграва́ла руку...
Час прайшоў, праляцеў назаўсёды,
Праплыла зноў на крыгах вясна.
Адплылі за табой параходы,
І ў гітары ахрыпла струна.
Я гітару тваю зберагаю
І стаю, нібы страж, ля ракі.
І цябе я з далечы чакаю
І кармлю белых чаек з рукі.

* * *

Згарыць папера, попел застанецца,
І спыніцца агонь, нібыта сэрца,
І ў цемру мы правалімся з табой,
Бы трэсне лёд над чорнаю вадой,
Што, нібы час, цячэ і не знікае.
Гарыць папера, бы крывёй сцякае
Грахоўны верш, што на паперы быў,
Што, як і мы, смяяўся і любіў
І гэты дзень, і гэтыя хвіліны,
Што з дымам адлятаюць ва ўспаміны,
Нібыта ў рай, які нас не чакае,
Нібыта ў свет, што сам сябе стварае,
Як верш грахоўны, што цяпер гарыць,
Не знаючы, што застаецца жыць...

* * *

Я зноўку адзін, як нявольнік, якога
Адпусцілі ў нямую пустэльню пажыць.
І прад мною, нібыта прад ветрам, дарога
На чатыры бакі спакушальна ляжыць.

Я ізноўку адзін, нібы цень адзінокі
Ад старога ля ціхай дарогі крыжа.

І ваду мне жывую прыносяць сарокі,
І мне хлеба хапае штодня ад вужа.

Я ізноўку адзін, як вада, прападаю
У пяску, што на месцы, як час, не стаіць.
Я іду, і куды я іду — добра знаю —
Да цябе, быць з табой, каб няволю любіць...

* * *

Праз ноч, як праз далеч, імчыцца цягнік
І крэсліць цямнечу, нібы чарнавік
Санета, які я табе прысвяціў,
Нібыта душу пад замок пасадзіў.
А ў тым цягніку, адзінокая, ты
Вяртаешся ў свет, дзе на рэчках масты
Табе збудавалі анёлы мае.
За вокнамі вецер, як скрыпка, пяе
І плача, патрэбных не знаючы слоў,
З бяроз абтрасае маіх салаўёў,
Якіх я паслаў, каб сустрэлі цябе,
Яны ж скамянелі ў нязнанай журбе...

Але ўсё ж імчыцца, імчыцца цягнік,
Нібыта з душы пра каханне мой крык...

* * *

Хутка снегам сады замятуцца
І сцяжыны забудуцца ў сад.
А пакуль што аблокі снуюцца
І шуміць, як агонь, лістапад,
У які я спакойна ступаю,
І плыву па-над садам, як дым,
І ў нябёсах сцюдзёных знікаю,
І з'яўляюся ў свеце чужым,
У якім аніштo не знаёма
І ўсё ж светла кранае душу,
Як партрэты бацькоўскія дома,
Як на ружах сузор'і дажджу...

Хутка снегам сады замятуцца,
Ды не знікне ніколі той сад,
У які мне заўсёды вярнуцца,
Быццам бы азірнуцца назад,
Дзе ўсё светла і дзе ўсё знаёма
І дзе родныя побач са мной,
Дзе ў стажку залатая салома
У снягах, быццам сонца, зімой...

* * *

...Дрэвы ператворацца ў вялікіх птушак
І да зорак, як да гнёздаў, палятуць,
Поўню жоўтую, нібы ліхтар, патушаць
І аблокі, быццам павуту, парвуць.
І глядзець ты будзеш, як яны знікаюць
У высокай далі, дзе табе не быць,
Бо ў далечы нас з табою не чакаюць,
Нам з табою гэты край любіць —
І глядзець на неба, быццам на ікону,
І маліцца Богу, і свой шлях шукаць,
І ў зямное шчасце верачы да скону,
Што такое шчасце, толкам і не знаць...
Дрэвы ператворацца ў вялікіх птушак
І разбудзяць пад асфальтамі траву,
Быццам Беларусь у адзінокіх душах,
Што яшчэ, як птушкі, на вятрах жывуць...

* * *

Ты далёка, як тое, што будзе праз год,
І таму я самотны, нібы параход,
Што на беразе ціхім, як прывід, стаіць.

Я гляджу на ваду — і не бачу вады,
Бачу белыя хвалі, бы ў кветках сады,
У якія не заўтра з табой нам хадзіць.

Хутка час праляціць, ды не ўсё праміне,
І самота мая не патоне ў віне —
Ты далёка, як тое, што будзе праз год.

І пайду я ў ваду, і зраблюся вадой,
Белай птушкай ты будзеш лятаць нада мной,
І на беразе будзе стаяць параход.

* * *

Неба над намі нібыта вада...
Зоркі, нібы залатая арда,
Сонна ўсплываюць з начной цішыні,
Быццам тапельцы з рачной глыбіні
Сонна ўсплываюць і свет захапляюць,
Дзе мы з табою нядоўга жывём,
Быццам бы свечкі, што плынь асвятляюць
Ночы, з якой мы ідзём, як цячом,
Быццам між пальцаў у смерці цячэ
Неба, якое нібыта вада,
Дзе мы з табою жывыя яшчэ,
Дзе і бяда — нам яшчэ не бяда,
Бо маладыя мы сёння з табою,
Быццам крыжы па-над новай царквою,
Што збудавана на тым, што было,
Што засталося, з вадой не сплыло,
А прарасло, як трава прарастае
Там, дзе агонь як арда залатая,
Там, дзе вада пад нагамі як неба,
Лёд на вадзе як застылае срэбра,
Срэбра разбітае намі арды,
Срэбра, якім напаўнялі раты
Да паднябення, нібыта да неба...

## ГІСТОРЫЯ АДНАГО КАХАННЯ

### САНЕТЫ ДЛЯ ЛЮДМІЛЫ

1

Даўным-даўно на вуліцах Масквы
З табой сустрэўся я, як нарадзіўся,
Як праз асфальт прабіўся шум травы
І цэлы свет травою асвяціўся.

І ажылі нябёсы нада мной,
І хмары паплылі, як успаміны
Пра родны дом, пра поле за ракой,
Пра квецень адзінокае рабіны.

І ты сказала мне, што я дзівак,
Што я жыву, самотны, тут не так:
Як можна жыць, уцёкшы на чужыну?

І пазіраў я ціха на цябе,
Нібы на свечку ў Храме, і ў журбе
Разгледзеў у табе сваю Айчыну.

2

І мы пайшлі па вуліцах Масквы,
Нібы па лабірынце Мінатаўра,
І мы ішлі няспешна да царквы,
І мы ішлі праз ноч у наша Заўтра.

І нам свяцілі ветла ліхтары,
І, дзе патрэбна нам, яны стухалі,
І, нібы кроплі восеньскай зары,
Лісты з бяроз у скверы ападалі.
І я тады маўчаў, нібы нямы,
Нібы страшыўся будучай зімы,
Што дзесьці ў хмарах ціха выспявала.

І ты глядзела доўга на мяне,
Як на святло далёкае ў акне,
І ты нічога пра мяне не знала.

3

...І вось мы разам едзем на клады,
Дзе пахаваны малады Ясенін,
Дзе клён асенні, нібы залаты,
Нібы фантан задумліва-асенні.

І ходзім мы сярод чужых магіл,
І адчуваем — гэта не чужое

Лісцё, што падае ў траву без сіл,
Але й не наша: наша не такое.

І мы гаворым пра свае клады,
І з намі Багдановіч малады
У вершах адзінокіх ажывае.

І ажываюць мары пра наш свет,
Дзе цэніцца, нібы жыццё, паэт,
Які жыццё, нібыта Храм, стварае.

4

Пачаўся дзень — бы рухнула сцяна,
Што ўчора раздзяляла цэлы свет,
І праз абломкі прарасла вясна,
Нібы з душы маёй табе санет.
І я, забыўшыся пра дзень, пісаў
Адной табе і пра цябе адну,
Пісаў і тут жа, як былое, рваў,
Пісаў, нібы сыходзіў на вайну.

А ты была з сяброўкамі ў кіно,
Здавалася, што з некім п'еш віно
І ўжо не помніш болей пра мяне.

І я глядзеў у чорнае акно,
З якога б, можа, вылецеў даўно,
Калі б цябе мой Бог не даў тут мне.

5

У жоўтым доміку Літінстытута,
Дзе непрызнаных геніяў гурма,
Ва ўсім паэзія, нібы атрута,
Даўно жыве «и сводит нас с ума».

У дворыку, які апеў Булгакаў
І дзе Платонаў смецце падмятаў,
Я над тваёй запіскай ціха плакаў
І вершамі адказ табе пісаў.

А ты сядзела з кнігамі старымі,
І ў думках ты была ў далёкім Рыме,
Дзе Цэзар для цябе падпаліць Рым.

І праклінаў я домік інстытута,
Дзе ты з паэзіяй, нібы з атрутай,
Якую трэба выпіць нам дваім.

6

Быццам дзяўчыну, царкву на Нерлі
Нёс у душы Караткевіч з каханнем,
Каб да царквы мы з табою прыйшлі,
Разам з царквою страчалі світанне.

Думалі мы пра Айчыну з табой
Чыстую-чыстую, белую-белу,
Быццам бы воблакі па-над зямлёй,
Быццам пакутнае Божае цела.

Нехта на нас падазрона глядзеў,
Я ж за табой да Айчыны ляцеў,
Ведаў, што там нас з табою чакае.

Светла стаяла царква на Нерлі,
Мы ад царквы адной сцежкай пайшлі.
Ты мне была ўжо зусім не чужая.

7

Мы зайшліся ў ЦДЛ начны
І, смакуючы, як славу, каву,
У цыгарным дыме незямным
Слухаем Булата Акуджаву.

Ён спявае, як цячэ святло,
І гітара, быццам ліст асенні,
Нас вяртае ў тое, што прайшло,
Ды не знікла, як знікаюць цені.

І табе я пра вясну кажу,

Пра дарогу і пра шум дажджу,
Пра каханне хочацца сказаць.
Ты таксама кажаш пра вясну,
Пра дзяўчыну сумную адну...
І я знаю, як дзяўчыну зваць...

8

...І раптам снег, нібы пажар, Маскву
Сваім бялюткім сумам ахапіў.
Мы ад яго схаваліся ў царкву,
Якую шчэ калісь француз паліў.

У Храме анікога не было,
І Храм няспешна плыў, нібы каўчэг,
На боскае прад вечнасцю святло
Праз нейчы ціхі плач, праз нейчы смех.

І мы плылі праз белую Маскву,
І ў небе людзі бачылі царкву
Бялюткую, нібыта першы снег.

І доўга снег свяціўся, як пажар,
Заціх, і ў небе поўня, як ліхтар,
Нам асвяціла шлях у светлы грэх.

9

А Масква савецкая яшчэ,
А Масква кабацкая даўно,
І па вуліцах жыццё цячэ,
Як па жылах таннае віно.

І купіўшы два білеты ў МХАТ,
Я цябе чакаю на Цвярскім
І гляджу спакойна на дзяўчат,
Хоць дзяўчаты як гашышны дым.
Вось і ты, прыгожая, як квет,
Як Шэкспіраў пра любоў санет,
Мне ідзеш насустрач па Цвярскім.

І што крок не проста мы бліжэй—
Неба па-над намі ўсё вышэй,
І нам добра ў горадзе чужым.

10

Цягнік, нібы мангольская страла,
Ляціць праз дзень і даганяе ноч.
Ты ля акна, нібыта ля цяпла,
Сядзіш, не зводзячы з дарогі воч.

А я застаўся ў горадзе адзін
На пару дзён, нібы на пару год,
Самотны, як на снезе апельсін,
Няшчасны, як забыты самалёт.

І я гляджу на вуліцу з акна,
Перада мною ноч, нібы сцяна,
Дзе твой партрэт іконаю вісіць.

І пройдзе ноч, нібыта пройдзе век,
І слёзы суму адлятуць з павек,
Нібы анёлы. Нам іх не забыць...

* * *

Яшчэ ўсё можна нам з табой змяніць
І словы не сказаныя сказаць,
І можаш ты мяне шчэ палюбіць,
Калі ўжо немагчыма пакахаць.

І гэты свет, дзе мы з табой жывём,
Не будзе клеткай залатой для нас.
І мост у рай ахопіцца агнём
І нам асвеціць наш з табою час.

Яшчэ ўсё можна нам з табой змяніць...
Ды рвецца шлях, як Арыядны ніць...
І я цяпер адзін, і ты адна.

І можаш ты мяне шчэ палюбіць...
І я магу ўжо больш віна не піць...
Ды чорны дзень між намі, як сцяна.

* * *

Гэты дзень праляцеў, як страла...
Гэты дзень прашумеў, як трава...
Ты са мной у царкве не была,
І самотна стаяла царква.

Гэты дзень як сусветны пажар,
Гэты дзень як сусветны патоп.
І анёлы глядзелі з-за хмар,
І вясна цалавала мне лоб.

Я на крыж, як на долю, глядзеў
І душой да анёлаў ляцеў
І не знаў, дзе цябе адшукаць.

Гэты дзень праляцеў, як страла...
Гэты дзень як царква без святла...
І мне ўслед нашы дзеці глядзяць.

* * *

Вось і ўсё... Цябе са мной няма,
Нібы сонца ў небе патанула
І прыйшла, нібыта смерць, зіма
І халодна ў вочы мне зірнула.

Вось і ўсё... Няма ўжо ў садзе руж,
Толькі снег бялюткі, як папера,
На якой твой вечна п’яны муж
Піша вершы пад Апалінэра.

Вось і ўсё... Каму і што казаць?
Мне пара ў чужыну ад’язджаць,
Дзе, магчыма, без цябе памру...

Вось і ўсё... За мной вятры ляцяць,

І ў вагоне мне ўсю ноч не спаць
І чакаць, нібы пажар, зару...

* * *

Гады прайшлі, нібы прайшлі дажджы,
І шлях назад размыты і забыты,
Але твой вобраз не прапаў з душы,
Ён свеціцца, нібы сасуд разбіты.

Нібы сасуд разбіты, не зляпіць
Таго, што не паўторыцца ніколі.
І час праз нас, нібы агонь, ляціць
І патухае пад крыжамі ў полі.

Я ведаю, што добра без мяне
Табе ў далёкай ціхай старане,
Дзе кожны дзень прыходзіць, быццам свята...

Я пра сябе нічога не скажу,
Я на нябёсы, як на Храм, гляджу,
Шапчу: «Ты ані ў чым не вінавата...»

* * *

...А шэры горад змыецца вадой,
Якая сыдзе з неба маладога.
І праз патоп мы паплывём з табой,
Нібы дамоў, шчаслівыя, да Бога.
Але пакуль сядзім мы ля акна
І ўсё глядзім на вуліцу чужую,
Дзе топіцца ў калюжынах вясна...
Ды я вясны сягоння не ўратую,
Бо я слабы, як першае цяпло,
Якое з небасхілу прарастала
І сонцам жаўруковым расцвіло,
Пакуль у змроку мёртвым не растала...
І ўсё-ткі шэрасць змыецца вадой,
І зноў трава прарэжацца з камення,
І праз гады мы будзем плыць з табой,
Як мёртвых кветак спелае насенне...

* * *

Гэты свет прыдумалі не мы,
І яго не перайначыць нам.
Нехта сёння вернецца з зімы,
Нехта ўжо ў зіму пакрочыць сам.

Вырасце на валуне трава,
І валун схаваецца ў траве.
Воблака ў нябёсах, як царква,
З веку ў век спакойна праплыве.

І мы ўбачым, як жыццё ідзе,
І не ўбачым анічога мы.
Нехта ў леце сёння прападзе,
Нехта заўтра вернецца з турмы...

* * *

На паперы белай белая зіма,
На паперы чорнай чарнаты няма,
Бо сягоння свята — выпаў першы снег,
І па снезе белым, як агонь, прабег
Абляцелае лістоты балаган —
І прапаў у снезе, быццам у туман
Праваліўся, асвяціўшы мне душу,
Сумную, як кропелька дажджу,
Што адна, схаваўшыся ў сухой траве,
Як анёлак малады ў старой царкве,
Будзе доўга жыць — пакуль дазволіць Бог...
Першы белы снег, нібыта белы мох,
Аплятае свет, дзе мы жывём з табой,
І ў жыцці, нібы ў снягах зімой,
Мы губляемся, і любім мы снягі,
Быццам мост над рэчкай любіць берагі,
Без якіх маста ніколі б не было...
Першы снег нібыта мёртвае цяпло
На паперы белай, дзе заўжды зіма,
На паперы чорнай, дзе зімы няма...

* * *

Вярнуўся дадому, нібыта прачнуўся,
Нібыта назад азірнуўся, дзе жыў,
Нібыта ў сцюдзёнай вадзе акунуўся
І стому, як пыл свой вандроўніцкі, змыў.
Старэнькія хаты і людзі старыя...
Але не чужыя, але не чужыя,
Як неба ў аблоках, у травах зямля,
Якія шчэ помняць, якім быў тут я
Малым хлапчуком, што не ведаў бяды,
І ўсё як тут ёсць, так і будзе заўжды,
Здавалася мне...
І хацелася мне
Вярнуцца дадому, нібыта прачнуцца,
Нібыта прад ветрам начным разагнуцца
І ўбачыць, што ўсё, што навокал,— не ў сне —
І добрыя людзі, і ветлыя хаты,
І крыж ля дарогі стары, як наш свет,
Дзе нашыя святы і сумныя даты
Душу напаўняюць, як вазу букет,
Каб заўтра ізноўку хто блізка, далёка —
Вярнуцца дадому, як жыць, захацеў
І з думкаю светлай, і з думкай высокай
У вёску, бы ў вечнасць з нябыту, ляцеў...

* * *

Сябе прапіў, нібы сябе забіў,
І жыць застаўся, каб зноў піць далей.
Каму і што ты добрага зрабіў?
Каму і што ты дрэннага зрабіў,
Каб за віном хавацца ад людзей?
І дзень твой быццам ноч, і ноч як дзень,
І верш нібыта нож, і нож як верш,
І ты ў свой лес ідзеш, нібыта цень,
І ў лесе, нібы воўк стары, жывеш
І ля агменю там сядзіш адзін,
І плачаш, і смяешся над усім,
І, як крывёй, лістотаю асін
Агмень ты корміш — і ўзлятае дым,

Нібы сівы груган, які любіў
Цябе і светлы свет, што ты прапіў…

А нехта па сцяжыне ўжо ідзе
Не да твайго агменю, да цябе,
Каб там з табой хавацца ад людзей,
За верш, як нож, схапіўшыся ў журбе…

* * *

У гэтым свеце немагчыма жыць,
Таму і паміраем мы штохвілі.
Нам гэты свет, нібы агонь, любіць,
Любіць, як матылі агонь любілі...
І ты гаворыш мне, што я дзівак
І веру, што збываюцца жаданні,
Ды і наогул, я жыву не так,
Як трэба жыць пад зоркаю кахання.
І я нічога не магу зрабіць,
Каб гэты свет спакойна разлюбіць
І адысці туды, дзе невядома,
Ці буду я ў гасцях, ці буду дома...
А ў гэтым свеце немагчыма жыць,
Ды мы жывём і радуемся шчыра,
Што можам свет, нібы агонь, любіць,
Не разлюбіўшы, адлятаць у Вырай...

* * *

Не хадзі ты ў карчму, не глядзі ты ў акно —
Там не знойдзеш чужых, там заўсёды свае
Сумна песні спяваюць і жлукцяць віно.
Ім не волі — віна для жыцця не стае.

Пад сталамі дубовымі кучы смяцця,
А пад столлю счарнелай гадзюкамі дым.
На каленях мужчын маладзіцы сядзяць
І на волю плююць, бо і так добра ім.

А прапіўшы апошні ламаны свой грош,
Яны будуць душу і цябе прапіваць.

І, прапіўшы душу, дурань, сціснуўшы нож,
Пойдзе брата свайго рабаваць, забіваць.

Ну а хто застанецца — зальецца віном.
Ім не волі — віна для жыцця не стае…
Не хадзі ты ў карчму, не глядзі ты ў акно,
Там не знойдзеш чужых.
Там заўсёды свае…

* * *

Аб сцяну залатую бяроз
Разбіваецца восеньскі вецер.
Навіну Вам пра гэта прынёс
Я сягоння, каб высветліць вечар,
У якім Вам самотна адной
Сярод кніг пра каханне і Бога.
Асвяціўся пакой навіной,
Асвяцілася наша дарога,
Па якой нам сягоння ісці
Да кахання, да веры, да Бога,
Як па зорках, па жоўтым лісці,
Як па золаце Храма старога,
Дзе маліліся нашы дзяды
І за нас, і за нашы бярозы.
І жывой мы шукаем вады,
І знаходзім пякучыя слёзы.
І глядзім, як аб сцены бяроз
Разбіваецца вецер сцюдзёны,
І ляціць па-над намі Хрыстос,
І счарнелыя плачуць іконы...

* * *

...А сёння канчаецца нашае лета,
Нібыта з арбіты сыходзіць планета,
І лісце на дрэвах за міг абгарае,
І сцежкі лісцё, як агонь, засыпае,
І нам не вярнуцца ў зялёнае Ўчора —
Навокал лісцё, як чырвонае мора,
І ў ім патанае і нашае лета,

І ты на балконе ўначы з цыгарэтай,
І я патанаю, каб заўтра з'явіцца,
І ў мора чырвонай лістоты ўлюбіцца,
І потым пісаць невясёлыя вершы
Пра нашае Сёння, нібыта быць першым,
Хто сум зразумеў, што ў лістоце чырвонай
Жыве і знікае, бы ў рэчцы сцюдзёнай
Жыве і знікае і нашае лета,
І срэбная стронга як сэрца санета,
Які мо напішацца некалі мною
Пра гэтае лета, што ўжо за спіною...

## ВЫКРАДАННЕ БЕЛАРУСІ

О Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цвет!
*Уладзімір Дубоўка*

...Над морам зжаўцелым травы
Шыпшыны лісточак зялёны
Вятрамі на злом галавы
Падхоплены ў неба шалёна.
А ў небе сцюдзёным, начным
Вялікія вечныя зоры
Аб нечым гавораць сваім
І што ім, што робіцца ў моры,
Над морам зжаўцелым травы,
Дзе птушкі, як душы, лятаюць,
Дзе людзі ідуць да царквы
І Бога, і праўду шукаюць.
І мала хто бачыць ля зор
Зялёны лісточак шыпшыны,
Самотны, як родны прастор,
І родны, як сум, і адзіны...

## У СВЯТЫ ВЕЧАР

Нікуды з Храма не спяшацца, нібы спаць
І ў сне, нібы чарвяк у кокане, пачаць
Вясновы ўзлёт у неба матыля малога,

Самотны ўзлёт душы бязбожнае да Бога.

Нікуды з Храма не спяшацца, бо ёсць Храм
І гэты дзень, што светлы, быццам бы віно
Анёльскае, якое сёння выпіць нам,
Нібыта зазірнуць у боскае акно.

Нікуды з Храма не спяшацца, як згараць
На інквізітарскім агні сярэднявечча.
Нікуды не спяшацца, нібы ў гэты вечар
З апосталамі Біблію пісаць...

* * *

Рана ці позна зіма праміне,
Быццам святло загарыцца ў акне
Ціхай кватэры, дзе ты не памрэш,
Быццам бы мой у душы тваёй верш,
Верш, што табе я адной прысвяціў,
Быццам бы свечку ў царкве запаліў.
Рана ці позна зіма праміне,
Рана ці позна не будзе мяне,
Вецер снягамі мой шлях замяце,
Шлях мой вясною праз снег прарасце,
Быццам святло загарыцца ў акне
Ціхай кватэры, дзе ты без мяне
Будзеш чытаць мой зажураны верш,
Верш, у якім ты, як рыфма, жывеш...

Рана ці позна зіма праміне...

* * *

Сёння шчэ восень, а заўтра — зіма,
Сёння шчэ воля, а заўтра — турма.
Сумна ўсё гэта, як зломаны крыж.
Ты праз акно, як праз неба, глядзіш
На адзінокіх людзей, што ў двары,
Быццам бы мышы ў каменнай нары,
Сонна шнырують, не помнячы, што
Самі яны — гэта тое святло,

Што адшукаць яны хочуць даўно,
Гледзячы ў неба, нібыта ў акно,
Дзе яшчэ восень, а заўтра — зіма,
Дзе яшчэ воля, а заўтра — турма,
І анічога табе не змяніць.
Праўда, ты можаш смяротна запіць
І не вярнуцца з кавярні дамоў.
Толькі ты сёння на двор не пайшоў
І праз акно, як праз неба, глядзіш,—
І, нібы з неба, з акна ты зляціш,
Можа, і сёння, а можа, й пасля,
Як з-пад снягоў зноў прагляне зямля...

* * *

Ты ведаеш даўно, што мы памром,
Праз вуліцы, залітыя святлом,
Сплывём, як воск са свечак у царкве,
Як у зямлю сплывае па траве
Раса, сабою жывячы траву,
Што й на магілах шэпча нам «жыву».
І хочаш жыць ты, як жыве трава
На вуліцы, дзе белая царква
Стаіць, як па-над свечкай белы дым
Стаіць, нябачны ўночы анікім,
Бо гэты дым з малітваю плыве,
Бо гэты дым, нібы анёл, жыве
У Храме, праз які аднойчы нам
Праплыць, як дыму праплываць праз Храм,
Праз вуліцы, залітыя святлом,
Праз думкі, што асветлены крыжом,
У свет стары, па-над якім трава,
У новы, на якім стаіць Царква...

* * *

Начныя вуліцы залітыя святлом,
Нібыта руслы рэк, залітыя віном
Краіны райскай, што начамі сніцца нам
У гэтым свеце, што даўно не Храм,
А дымная майстэрня п’яных падмайстроў,

Што любяць гаварыць пра грошы і любоў.
Начныя вуліцы, залітыя святлом,
Люблю, як вершы Блока, пачытаць прад сном
І ў вуліцах згубіцца, быццам патануць
І быццам бы ў краіну райскую зірнуць
І ўбачыць руслы рэк, залітыя віном,
Нібыта вуліцы, залітыя святлом,
Дзе я адзін іду, нібы плыву, дамоў
Ад маладых жанчын і п’яных сябрукоў,
Каб зноўку вершы Блока перад сном чытаць,
Пакуль начныя вуліцы не спяць...

* * *

Калі зноў пачынаюцца дажджы
І божы дзень нібыта ноч сівая,
На сцежцы палявой растуць глыжы,
Нібы сцяна з нябыту прарастае
Старога замка, што раней тут быў
І ад чужынцаў бараніў краіну,
Самотную, нібыта дым, што сплыў
Ад вогнішча, якое Бог пакінуў
І ў дождж пайшоў, зрабіўшыся дажджом,
Які размыў дарогі палявыя
І цішыню, налітую святлом,
Дзе мы былі, як матылі начныя,
На сцежцы, на якой растуць глыжы,
Нібы сцяна з нябыту прарастае
У божы дзень, калі ідуць дажджы,
Калі душа душу, як рай, шукае...

* * *

...У зіме адзінокія мы,
Як у вёсцы старыя дамы,
У якіх аніхто не жыве.
І самотна глядзім мы на свет,
Як прад выстралам на пісталет
На дуэлі няшчасны паэт,
У якога няма ў галаве
Думак светлых пра гэта жыццё.

І, як воўчае ў полі выццё,
Уначы пад акном гул машын.
А над горадам, нібы мурын,
Самалёт абгарэлы ляціць.
Ёсць гарэлка, і можна запіць,
Каб забыцца, што сёння зіма,
Што цябе тут са мною няма,
Нібы думак вясёлых прасвет,
Дзе з дуэлі няшчасны паэт
Адзінокім вярнуўся дамоў,
Нібы воўк, што ўцякаў ад ваўкоў...

* * *

Ад нас застануцца не нашы пасады,
А нашы дарогі і нашыя хаты
Ад нас застануцца... Без нас застануцца...
Назад не вярнуцца... Дамоў не вярнуцца,
Каб нешта зыначыць, каб нешта сказаць.
Мы будзем усе пад крыжамі ляжаць,
А з часам не будзе й над намі крыжоў,
Самоты не будзе ў Краіне дажджоў,
Якую з табой мы ствараем даўно,
Смакуючы каву, і сонна ў акно
Падоўгу глядзім і не бачым вясны,
Якая прыходзіла ў нашыя сны,
У нашыя мары, якімі жылі,
Калі мы з табой маладымі былі...
Ад нас застануцца не нашы пасады,
І будзе смяяцца з нас дзядзька багаты,
І сонца загляне ў Краіну дажджоў,
І дрэвы зноў вырастуць з нашых крыжоў...

## ЛЕТА ПРАЙШЛО...

...Счарнела вуголле, і дым,
быццам воран сівы,
адляцеў,
І холад на лёзах травы
зноў развесіў расу маладую.

І ноч, быццам kроў,
праступіла
праз вату зялёную дрэў,
За мной пацякла,
як пясок, размываючы ціш нежывую.

Вярнуцца ніколі не позна,
было б жа вяртацца куды.
І вернецца лета,
ды лета ўжо будзе не тое,
І я ўжо не буду,
як гэта на травах раса, малады —
Пад ногі ўпадзе з дрэў лісцё,
як агонь, залатое.

Вярнуся дамоў,
быццам бы апякуся,
прачнуся ад сну,
І ўбачу, што лета прайшло
і мяне тут ніхто не чакае,
І ў вокны сляпыя,
нібыта ў той свет,
быццам воран, зірну —
Самота мяне абаўе,
быццам камень — змяя маладая.

* * *

...І трэснула неба, як шкло на іконе,
І свет раздзяліўся на Заўтра і Сёння,
І людзі завылі сівымі ваўкамі,
І зоркі з нябёс папаўзлі павукамі
На нашу зямлю, як на мошку малую,
Якой больш не лётаць, але шчэ жывую.
З забытых магіл мерцвякі паўставалі,
І травы, нібыта зялёныя хвалі,
На міг ускіпеўшы, заціхлі, зжаўцелі.
Як д’яблы, з асінаў лісты паляцелі
І селі на Храмы, і Храмы прапалі,
Нібыта ільдзіны пад сонцам расталі...
І раптам аднекуль ты мне пазваніла

І сон мой, нібыта люстэрка, разбіла,
Куды я глядзеў і не бачыў, што Сёння
Пакрылася пылам, як шкло на іконе...

* * *

Нарэшце дачакаліся цяпла...
Нібы ў душу патрапіла страла,
Што прыляцела з прамінулых год.

Увысь гляджу, як воўк на лес, гляджу,
Як жыць хачу, хачу хутчэй дажджу,
Які ажывіць, як траву, народ.

Хацець — не грэх, але чаго няма —
Таго й са свечкай тут шукаць дарма,
А ў нас жаданняў хоць ты прадавай.

І ты бяжыш пад сонца ўсё хутчэй,
Ды ўжо разліты на твой шлях алей,
І ўжо грукоча, нібы гром, трамвай...

## У ВЕЧНЫМ ГОРАДЗЕ

У Вечным горадзе, куды прыйшлі вандалы,
Няма нікога, хто б сказаў: «А я — святы...»
І смерць мяне, як роднага, штодня шукала.
На пляцы рос агонь, як д’ябал залаты,—
Гарэлі кнігі, што былі для нас святымі.
І вецер звар’яцела паднімаў смяццё
Над горадам, дзе ў воблаках і ў жоўтым дыме
Чакала нас, смяротных, вечнае жыццё.
А я ў карчме сядзеў і піў віно з жанчынай,
І пра вандалаў анічога я не знаў.
Сябры крычалі мне: «Глядзі, прап’еш Айчыну!»
І падлівалі, хітрыя, паўней віна.
Я піў віно, забыўшыся пра ўсё на свеце,
Не чуў, сп’янелы, шэпту: «Вунь сядзіць вар’ят...»
Я вольным быў, як вольны разбуральны вецер,
Я быў рабом, які прывык да цёню крат.

А ў Вечным горадзе ўладарылі вандалы
І бушаваў па вуліцах, як вір, пажар,
І смерць мяне, як роднага, штодня шукала
І, адшукаўшы, плюнула агнём у твар.

## ШЛЯХ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Цёмна, цёмна ў родным краі.
На крыжах вятрыска грае.
Дзе святло? Святла няма.
Доўга цягнецца зіма.
Нібы воўк, завея вые.
Люд маўчыць. Няўжо — нямыя?
Да агню ідзе Максім.
Воўчы цень ідзе за ім.
А наўкол адна бядота,
І жыццё нібы балота.
Што з таго, што ні граша!
Ёсць галоўнае — душа
У людзей, што ў родным свеце
Патаемна сняць аб леце.
Цёмна, цёмна — хоць ты плач,—
З неба зоры ўкраў крумкач.
Да святла дайсці ўсё ж трэба.
Тут зямля, тут наша неба,
Тут шынок, а тут турма,
Нават нашая зіма.
На крыжах завея грае.
Кожны крыж свой выбірае.
А ў Гарэцкага дарога
Да вясны, Святла і Бога...
Дойдзе, дойдзе наш Максім.
Нам ісці лягчэй за ім.

## ЧОРНАЯ ПОСТАЦЬ

Жоўтае лісце плыве па вадзе,
Чорная постаць па лузе ідзе.
Чорная постаць глядзіць на мяне:

— Хто там плыве сярод рэчкі ў чаўне?

Што мне сказаць ёй? Я лепш памаўчу,
Плыць, нібы лісце, маўкліва хачу.
Чорная постаць ляціць над ракой:
— Хто ты такі, адкажы мне? Пастой!..

Я ж уцякаю, нібыта вар'ят,
Праз туманы, праз нямы лістапад,
Покуль не ўбачу між хмар над сабой
Белых анёлаў з трубой залатой.

...Човен па рэчцы, як прывід, плыве,
Нехта мяне ўжо дадому заве.
Крыкнуць спрабую: «Дамоў не хачу!»
Чорнаю постаццю ў неба лячу.

* * *

Ад'язджаем, быццам паміраем
І знікаем з памяці людской.
Рэчы ў сумкі спешліва складаем,
Ціха размаўляючы з дачкой.

Ноччу дождж нам грукатаў у шыбы,
Дый цяпер хмурыны шчэ плывуць,
І лісты ў калюгах, нібы рыбы,
Свецяцца, варушачы траву.

Мы ж не бачым гэтага нічога.
Да аўтобуса праз дождж бяжым.
Шэрая прамоклая дарога,
Ад якой сцюдзёна на душы.

А дачка смяецца, як заўсёды.
Ёй наперад весела глядзець.
І чаго глядзім наўкол з самотай —
Ёй, малой, не хутка зразумець.

* * *

А на праспекце кветкі і плакаты
І даўганогія ля крам дзяўчаты
Чакаюць шчасця, а яно — як дым.

Пра сум, што з сэрца не знікае,
У скверы гітарыст спявае,
Пабліскваючы зубам залатым.

Усе клянуць бязбожную спякоту
І целамі, вільготнымі ад поту,
Кідаюцца пад цені і вятры.

А я з царквы вяртаюся дахаты,
Шчаслівы і на грошы не багаты,
І да дажджу нам жыць яшчэ дні тры.

* * *

Чырвоную гліну — застылую кроў,
Чырвонае вогнішча дымных гадоў
Дажджы размываюць і беляць снягі,
І ў рэчкі ніжэюць штогод берагі.
І рэчка мялее, і наша жыццё
Драбнее, марнее, нібыта лісцё
На дрэвах, што ў цемры змярцвелай, сырой
Знайшлі ад вятроў звар'яцелых спакой.
Чырвоная гліна да ног прыстае,
І ногі ўрастаюць у гліну мае,
І я не знаходжу дарогі дамоў.
І я ўжо не бачу застылую кроў
У гліне чырвонай знямелай ракі,
Толькі я чую, як выюць ваўкі.

## КАЗКА ПРА КАВЯРНЮ СМЕРЦІ

Я зноўку прыйшоў у кавярню начную
І ўбачыў Яе. Яна ціха смакуе
Чарнюткую каву і курыць паважна.

— Скажыце, паненка, адной вам не страшна? —
Пытаю ў Жанчыны і побач сядаю.
Яна мне гаворыць: «Сядаць я не раю.
Мяне ты не знаеш і знаць не спяшайся.
Дзяўчат тут хапае, ты ў іх закахайся...»
Ды я не ўцякаю ад вабнай Жанчыны.
Як вечнасць, самотна праходзяць хвіліны.
Сяджу, як чакаю за грэх пакарання,
І думаць не думаю я пра каханне...
І ўжо я ўцячы ад Жанчыны гатовы,
Ды чую Яе найласкавыя словы:
— Ты будзеш маім. Табе хочацца смерці?..
...Гляджу, а ў кавярні — не людзі, а чэрці.
Успомніць малітву — не ўмею маліцца.
І ўспомніў: нячысцік жа крыжа баіцца.
Ды ціха і сумна Жанчына гаворыць:
— Ты ў Бога не верыш — тваё гэта гора.
Шкада мне дурнога цябе, маладога.
Ідзі ты з кавярні, не помні нічога...
І выйшаў на вуліцу я ап'янелы,
І ў неба начное кавярня ўзляцела.

* * *

Яшчэ будуць высокія мяккія травы,
У якіх мы з табою заблудзімся ўночы.
Будзе чорная ноч, нібы чорная кава,
І яе да світання мы выпіць захочам.

А пакуль што дажджы нам грукочуць у вокны
І зрываюць лісцё, нібы маскі старыя,
З дрэў прыціхлых, і вецер, нібыта шалёны,
У трубу вадасцёчную весела вые.

Пройдзе час, і дажджы зноў аціхнуць памалу,
У калюгах патонуць далёкія зоры.
Як нам радасці часта з табой не хапала,
Як мы рэдка з табой пра самоту гаворым!

Ты глядзіш у акно, як у вечнасць нямую.
Што ты бачыш, скажы, за дажджлівай смугою?

Ты гаворыш: шкада мне пчалу залатую,
Што ўжо скрадзена з ружы вадой дажджавою…

Яшчэ будуць высокія цёплыя травы,
Яшчэ будзе пчала па-над кветкамі віцца.
І пайду я па горадзе ў пошуках стравы,
Ты ў царкву — за здароўе дзяцей памаліцца.

* * *

Зноў без вас не знаходжу спакою,
На дарогу гляджу і гляджу.
Памахаўшы самотна рукою,
Вы пайшлі ў каралеўства дажджу.

Я ж застаўся адзін-адзінокі,
Нібы клён сярод злосных вятроў.
Я да вас пасылаю аблокі,
Як паштовых сваіх галубоў.

Я штохвілі адказу чакаю,
Хоць чакаю, напэўна, дарма.
Вы сказалі: «Цябе не кахаю,
Бо ў цябе закахана зіма...»

Зноўку я на дарогу гаротна,
Быццам бы на ікону, гляджу.
Заўтра раніцай ценем самотным
Я пайду ў каралеўства дажджу.

## РУЖА

У чырвонай ружы спіць світанне,
Як спакуса ў келіху віна.
З ружы пачынаецца спатканне,
У якім таемнасць, як вясна.

Цалаваная туманам ружа
Нагадае сад, дзе нам з табой
Дзьмухаўцоў абуджаная сцюжа

Несла адзіноту й неспакой.

* * *

Восень. Самотная восень Айчыны,
Жоўтае лісце і ў скверы кастры.
Нас пакідаюць навечна жанчыны,
Нас прадзімаюць да смерці вятры.

Родныя постаці ў вечнасць знікаюць,
З імі гавораць анёлы і Бог.
Свечкі ў цямнечы гараць, дагараюць,
Не асвятліўшы ў ратунак дарог.

Вечна пад небам у сумнай Айчыны
Сумныя думкі, душы неспакой.
Попел на вогнішчах стоена стыне,
Дым адляцеў і растаў над зямлёй.

Хочацца з дымам у неба падняцца,
Следам за роднай душой паляцець.
Толькі ад тлумнасці не адарвацца,
Толькі і ў тлуме дашчэнту згарэць.

Восень. Самотная восень Айчыны,
Чорнае лісце і попел кастроў.
Нас пакідаюць, як вечнасць, жанчыны.
Мы застаёмся адны ля крыжоў.

АДЗІНОКІ

Юрыю Гуменюку

Ён ля акна смакуе каву
І слухае замежны рок.
Дзяўчаты ходзяць, быццам павы,
І п’юць каньяк, нібыта сок.
Кароткія, як ноч, спадніцы
Букетамі спякотных ног
Яго чаруюць. Дым клубіцца
Ад цыгарэт, і ён, як Бог,
Глядзіць на ўсіх, хаця ў кішэні

Няма й ламанага граша.
Якія вабныя калені,
Ажно заходзіцца душа.
У джынсах цёртых кавалеры
Бяруць за таліі дзяўчат,
Вядуць, вясёлыя, за дзверы
І не вяртаюцца назад.
А ён сядзіць, смакуе каву,
Як вусны прыгажунь начных.
І марыць, як заўжды, пра славу,
І праклінае свет услых.
Дакурыць ціха цыгарэту
І цяжка, стомлена ўздыхне:
— Ізноў адзін дамоў паеду…
І д'ябла ўбачыць у акне.

## САД ВЕЧНАЙ САМОТЫ

Хочацца плакаць ад вечнай самоты,
Што разраслася пад небам маім.
З дрэў аблятае сухая лістота,
З вогнішча — іскры густыя і дым.

Ветру няўтульна ў пакінутым садзе,
Дрэвы старыя, як вязні, стаяць.
Радасці мала даўно ў лістападзе,
Хочацца нават пра гэта крычаць.

Моўчкі ў агонь падкідаю лістоту,
Дым самагубна ў аблокі плыве.
Густа травы набуяла ля плоту,
Вечна застацца пад плотам траве.

Сад я пакіну, вярнуся дахаты,
Толькі вяртанню ўсё ж буду не рад.
Будуць мне сніцца, як смерць, лістапады,
Будзе мне сніцца пакінуты сад.

* * *

Вячэрняю смугой затоплены прасторы,
І чутны птушак крыкі ў купале нябёс.
Самотнае жыццё — яшчэ зусім не гора,
Але ўсё роўна вочы свецяцца ад слёз.

Яшчэ ў двары блукае і спявае свята,
І ад вазоў гасцёвых не асеў шчэ пыл,
Ды хочацца ізноў гасцей паўнютку хату,
Хаця, відаць, не хопіць весяліцца сіл.

І пройдзе ўсё ж самота, нібы цень ад хмары,
І стане ўсё звычайным: дзень, жыццё і сон.
І нам штодня глядзець у сумныя абшары,
Дзе плыў у вечнасць пыл,
дзе плыў праз душы звон.

* * *

Леаніду Дранько-Майсюку

У далечы ад роднае Гарыні,
Там, дзе на бераг прызямляўся Бог
І гліну браў, ляпіў дзяўчат у міні,
Пускаючы на тысячу дарог,—
Ідзе паэт па мармуровым Рыме,
І, вершы прысвячаючы для А.,
Віна фалернскага за нас падыме
У чашы з бронзы цёмнай і святла —
І на сардэчныя праллье скрыжалі
Незразумелы райскі неспакой.
Па ім дзяўчаты ўжо засумавалі,
А ён сумуе толькі па адной,
Што любіць кветак тонкую спакусу
І разумее пацалункаў сэнс.
Вяртанне да адзінай без прымусу —
Як самы геніяльны паланез.
...Ідзе паэт па невядомым Рыме
Дарогаю да сонечных Афін,
Натхняецца дзяўчатамі чужымі,
Цалуе ручкі ў іх, нібы ў багінь.

У далечы ад роднае Гарыні,
У божы дзень, калі сустрэўся з А.,
У Менску прадаваліся вяргіні,
Кавярні працавалі дацямна —
І гэта быў другі пачатак свету,
Дзе за каханнем ценю не відно.
І Бог прыйшоў, і Бог сказаў паэту:
«Ты ёсць паэт, і кроў твая — віно...»
І, не сказаўшы болей анічога,
Ён паляцеў у цемру да святла...
Праз Рым ідуць сардэчныя дарогі
З адзінаю дарогаю да А.

* * *

Спачатку музыка была.
Яна з'явілася з святла,
Якое знікла назаўжды,
Як зніклі райскія сады,
Што сёння толькі ў снах цвітуць.
Але ўсё ж яблыкі растуць
Над светам, дзе няма цяпла,
Дзе людзям хочацца святла,
Дзе людзям хочацца, каб Бог
Пачуў малітвы, дапамог
У цяжкі час, нібы было
Калісьці лёгка і цвіло
Каменне ля шляхоў людскіх,
Дзе нам да музыкі штоміг
Ісці, не верачы ў яе.
Ды ўсё ж яе нам не стае.
Яна з'явілася з святла,
Яна жыве, яна была
І будзе, покуль будзем мы
Ісці праз ветравей зімы,
Дзе нам непадуладны час
І дзе ніхто не знае нас.

* * *

Каркаюць абрыдліва вароны,

Вецер лісце рве, нібы шалёны,
З дрэў, якія чырванню гараць.

І крыжы на Храмах залацеюць,
Свечкі на магілах палымнеюць,
Людзі, як падсудныя, маўчаць.

І няма нікому суцяшэння,
Толькі скачуць цені, толькі цені
Ведаюць дарогу з небыцця.

І патухнуць свечкі, сыдуць людзі,
І чырвона ў наваколлі будзе
Ад апалага з асін лісця.

* * *

А за акном счарнелыя галіны
Старой, як гэты свет, рабіны
Гайдаюцца на цёплых хвалях ветру.

Са стрэх прагнутых мокры снег спаўзае
І цішыню на шоргат раздзірае,
Ныраючы спалохана ў паветра.

На падваконніку вазон красуе,
І кветачка ягоная ратуе
Мяне ад распраклятай адзіноты.

А за акном счарнелыя галіны,
І я цябе чакаць штодня павінны,
Нібы збавення ад зімы й самоты.

* * *

Вось і лісце апала на бруд і калюгі
І ў дварах апусцелых самота і змрок.
У скляпенні схаваліся ўсе валацугі —
Іх цяпер як няма.
У сцюдзёнасць аблок
Я гляджу, нібы ў вечнасць, якой не належу.

І агонь у двары як чырвоная вежа,
Дзе галодныя д’ябля і цмокі жывуць.

* * *

На шэрым снезе чорныя гракі
Клююць свой цень, збуджаючы ад сну
Карэнне траў, што сняць сваю вясну.
Палонкі — вочы цёмныя ракі —
Глядзяць у неба, дзе вятры пасуць
Зімовых дзён апошняе святло.
А хмары снег яшчэ вязуць,
Не разумеючы, што ўсё сплыло
Іх панаванне ў сумнай вышыні.
І ўжо даўно вясна не за гарой,
І дрэвам хочацца зноў цеплыні,
Каб шум лістоты ўскінуць над сабой.

...На шэрым снезе чорныя гракі,
І сакавік у трэшчынах ракі.

* * *

Вецер згінае высокія дрэвы,
Лісце зрывае, ламае галлё.
Нашы сцяжыны змывае залева,
Цені лятаюць праз наша жыллё.

Нам жа не страшна — я сёння з табою.
Свечкі агеньчык каля абразоў
Нам асвятляе шляхі да спакою —
Шлях праз каханне і шлях праз любоў.

Ціха ў пакоі, нібыта ў тым свеце,
Скуль мы прыйшлі і куды нам пайсці.
Б’ецца аб шыбы раз’юшаны вецер —
Дзверы ў кватэру не можа знайсці.

...Вецер зацiхне, дамы пасвятлеюць.
Дрэвы спакойна ізноў зашумяць.
Дрэвы таксама, як мы, зразумеюць:

Тое, што страчана — не адшукаць.

Страчана вечнасць на нашай планеце.
Мы прывыкаем без вечнасці жыць.
Дрэвы ламае высокія вецер,
Нашы сцяжыны змываюць дажджы.

**3**

НЕБА

Неба гэта возера святла
На дне якога занесеная ветрам
Жоўтая лістота з райскага саду
У небе жыве Бог
Ён бачыць усё і ўсё чуе
Бо неба і ёсць Бог
Да неба імкнуцца ўсе
Травы і дрэвы птушкі і людзі
У небе жывуць анёлы
Якія ля Млечнага Шляху
Трымаюць кавярні і шынкі
У якіх душы летучы да Бога
Могуць паслухаць анёльскія песні
І канчаткова вырашыць
Дзе ім быць на зямлі ці на небе
Неба палохае сваёй глыбінёй
І я седзячы ля агню
Гляджу як ручаёк дыму
Імкнецца ў неба і там знікае
Забыўшыся пра тых
Хто яму даў жыццё

ВАДА

Паміж спякотай і спякотай
Як паміж берагамі
Вада
Вада ратуе ў час смагі

Вада губіць у час патопу
Вада гэта пекла
Якога баіцца бруд
Вада гэта рай
У які імкнуцца ўсе
І я стоячы на беразе ракі
І гледзячы ў бок адкуль цячэ вада
Бачу сваё мінулае
І гледзячы ў бок куды цячэ вада
Нічога не бачу
Акрамя вады
Якая ратуе ў час смагі
Якая губіць у час патопу
Якая ратуе
Якая губіць

## ДРЭВА

Дрэва трымаецца за зямлю
Дрэва трымае неба
Зямля забірае попел ад дрэва
Неба забірае дым ад дрэва
А мне застаецца цяпло
А мне застаецца дрэва
Якое будзе труной
І ніхто не знае дзе тое дрэва
Але яно трымаецца за зямлю
Але яно трымае неба
І я іду да дрэва
І я губляюся сярод дрэў
І я знаходжу дрэва
Якое саграе мяне
Пакуль я іду

## ЗОРКА

Зорка заўсёды вышэй
Ідучы праз пустэльню
Вандроўнік глядзіць на яе

Вязень седзячы ў астрозе
І гледзячы праз краты
Па зорцы пазнае што ў свеце ноч
Зорка гэта свечка
У Храме сусвету
Запаленая самім Богам
Зорка гэта люстэрка
У якое глядзяцца анёлы
Рыхтуючыся апусціцца на зямлю
Зорка гэта ружа
Ля якой як матылі
Лётаюць людскія душы
І я гледзячы на зорку
У думках лячу да яе
А яна далёка як маё дзяцінства
А яна маўклівая як залатая рыба
Якая не імкнецца да сузор'я Рыб
А любіць адзіноту

ЦЕНЬ

Цень хамелеон
Які мяняе не колер а памер
Ад ценю як ад свайго я
Нікуды не ўцячэш
Цень пільнуе
Цень не крыўдлівы
Галоўнае каб было сонца
Цень цярплівы
І не разабрацца
Што яму падабаецца больш
Я ці сонца
Цень лянівы
Цень прыліпала
Цень дражніцца
І яго можна павесіць
Але толькі павесіўшы сябе

## КАЛОДЗЕЖ

Сярод поля калодзеж
І адзіная сцежка ў полі
Гэта сцежка да калодзежа
Які яшчэ стаіць на ўліку
У самога Вадзянога
І калі каля калодзежа
Збіраецца шмат людзей
Ён адчувае сябе
Цэнтрам зямлі
І ад пыхі і хвалявання
У ім прачынаецца рэха
І круціцца і рыпіць калаўрот
І раскручваецца ланцуг з вядром
Як нітка Арыядны
І стукаецца вядро аб зруб
Як язык у звона
І плюхаецца ў ваду
Як шалом воя
І ўздымаецца вядро
Як найкаштоўнейшы скарб
І вада цячэ з вядра
Як з неба зорны дождж
І радуюцца людзі яе прахалодзе
І застаецца калодзеж адзін
Сярод поля і свету
І ўглядаецца ў неба
Пакуль у ім ёсць вада
Пакуль звініць вядро
Пакуль сам Вадзяны
Трымае калодзеж на сваім уліку

## ШКЛО

Шкло раздзяляе мяне і свет
І плача калі ідзе дождж
І смяецца калі свеціць сонца
Шкло не пускае да мяне птушак і машкату
Але заўсёды пускае святло і цемру

Часта шкло ўяўляе сябе небам
У якога адабралі не толькі Млечны Шлях
Але і зорку Венеру
На якую любяць глядзець паэты
Шкло з гэтае прычыны злое
Але маўклівае
Шкло гатова ў любую хвілю
Рассыпацца на тысячы аскалёпкаў
Але гэтага яно і баіцца
Бо тады праз яго не будуць
Праходзіць як праз мытню да мяне
Святло і цемра
Бо тады аскалёпкі шкла
Змяце ў кучу сварлівы дворнік
І лаючыся занясе на сметню
Таму шкло палахлівае
І баіцца мяне
Але найбольш баіцца хлапчукоў
Якія гуляюць з мячыкам
І б'юць пустыя пляшкі аб камень
На якім аскалёпкі шкла
Свецяцца як апошнія промні
Вячэрняга сонца

## ДЗЕНЬ

Паміж начамі дзень
Ён як меч у похвах які ведае што ён меч
Меч які бароніць ад нябыту
І які нясе нябыт
Дзень ідзе нягледзячы на гадзіннікі
Якія за ім спяшаюцца
Круціць свае стрэлкі
Дзень чаканы госць
Які асвятляе сваім святлом
І радасць і бяду
Які асвятляе шлях
Куды выходзяць усе
І жабракі і разбойнікі
Але ўсім дзень дае

Тое што хто хоча
І я гледзячы праз акно на дзень
Дзякую Богу
Што ізноў на двары вясна
У якой ёсць мой дзень
Дзень майго нараджэння

## ГЛІНА

Гліна ўмее чакаць
Чакаць калі яе знойдзе майстра
Гліна спіць але да таго часу
Пакуль яе не кранецца
Раскруціўшы на ганчарным крузе
Цеплыня рук
Гліна часцей за ўсё чырвоная
Нібыта саромеецца таго што яна гліна
І што яе на зямлі пакінуў сам Бог
Сказаўшы ёй што толькі ў цярпенні
З гліны можа што-небудзь атрымацца
У гліны добры характар
Але гліна не ўсіх слухаецца
Яна мае сваю думку
Наконт стварэння прыгажосці
І самога стваральніка
І я шукаючы гліну
Шукаю сябе
І знайшоўшы гліну
Спрабую зразумець сябе
Але гліна слухаецца толькі майстра
І яна ўмее чакаць

## ВАЛУН

Прыкаціўшыся бог ведае адкуль
Валун грэецца на сонцы
Валун вышэй травы
І яго ўсе заўважаюць
Птушкі на ім адпачываюць

Як на востраве сярод зялёнага мора
Мурашкі даследуюць валун
Лічачы яго сваім збудаваннем
Пачатку мурашынай эры
Божыя кароўкі ўзлезшы на валун
Узлятаюць успомніўшы пра сваіх дзетак
Што без іх засталіся на небе
Валун заўсёды ў цэнтры ўвагі
У яго трапляюць маланкі
Але валун не скардзіцца на свой лёс
Бо ён валун
Бо ён лянотнік
І яму не трэба нічога
Акрамя зямлі на якой ён ляжыць

ТУМАН

Туман спадманвае і заманьвае
Туман як павута
Лёгка трапіць у яго і цяжка выбрацца
Але вецер не баіцца туману
І ў тумане ён можа адпачыць
І ніхто не заўважыць лайдака
Якога паслала сонца
Каб ён разагнаў туман
Туман як слімак паўзе па траве
Пакідаючы росны след
І я раніцай ідучы ў грыбы
Апякаю босыя ногі
Я не баюся згубіцца ў тумане
Бо маці сказала што я ўжо вялікі
А мне дванаццаць гадоў
І я яшчэ нічога не баюся
І тым больш туману
Які толькі белы спадман
У якім лайдак вецер
Спіць пад кустом
І ад яго дыхання шапаціць лістота

ТРАВА

Трава зялёнае полымя
Якое раздзімаюць дажджы і сонца
Як толькі сыдзе снег
Яно распаўзаецца па зямлі
І нельга траву спыніць
Трава ўсё перартрывае
І вастрыё плуга і вастрыё касы
І толькі сцежкам і дарогам
Трава саступае месца
Але і то да таго часу
Пакуль я па іх хаджу
Трава ведае якая яна трава
Яна можа даць сілу
І можа забраць жыццё
Трава сябруе з ветрам
У якога няма сваёй хаты
І толькі снег варагуе з травой
Бо ён не ведае што такое трава

ПЕРШЫ ТЫДЗЕНЬ БЕЗ ЦЯБЕ

Панядзелак

Позна прачынаюся помнячы панядзелак
Ахоўнага анёла адпрэчваю
Няхай небу нясе навіны
Я
Дзякую што ёсць дзень
Зноў знікаю з зацішы
Еду
Лістапад ліхтароў у лужынах
Ахвота адшукаць адзіную
Кубачак кавы купіць

Аўторак

Аднаму адзічэць
Увечары ўчуць уздыхаеш

Ты тутэйшая
Одум
Ружа раніцы расой расквеціцца
Адразу адкрыецца абшар
Кляштар князёўны каханай

Серада

Смуга сонца слепіць
Енчыць
Рэха ў ракавінцы рачной
Абрыдла
Думаць дайсці дачакацца
Амаль атрута

Чацвер

Чаканне
Абуджае адвечнае
Ціхае цёплае
Выдумаць вежу ветразь
Ехаць
Ростань радніць розных

Пятніца

Помніцца погляд панядзелак
Яблык
Тоіць таксама тое
Навокал наша невядомасць
Імгненне
Цёмна ціха
Альтанка і анёлы ў аблоках

Субота

Сумна сядзець у скверы
Уздыхаць узірацца
Бачыць былое блізка як бераг
Оду
Табе трызніць

Аднак адчуваць адчай

Нядзеля

Нічога новага як Ной
Я
Дзіўлюся дню
Заўтра зноў
Еду
Лета ляціць
Як у яму

## КОЛА

Па лугах і палях
Коціцца коціцца кола
Кола вырвалася на волю
І ўсяму здзіўляецца
О-О-О-О-О-О-О-О-О-О
Зайцы варачы піва
Па рэцэпту самога Караткевіча
Убачылі кола сталі ў яго пытацца
Ты хто абруч з нашай бочкі
Ці проста нуль
А кола зайцам адказала
Я і абруч з вашай бочкі
Я і нуль але нуль не абы-які
А ад самога мільёна
А вецер што ляцеў за колам
Зашумеў запыліў
Гэта маё кола я яго ўкраў
З карэты самай пекнай панны
А я ішоў па дарозе
І ўбачыўшы кола
Якое цацілася па палях і лугах
Пажадаў яму шчаслівай вандроўкі

## ЯБЛЫК

У яблыку жыве спакуса
Яблык ведае сваё я
І ўвосень трымаючыся за галінку
Як тапелец за саломіну
Яблык апошняй кропляй лета
Свеціцца на скрыжаванні вятроў
Яблык не ведае што яго любіць
Шэры адзінокі верабей
Які колькі ўжо дзён чакае
Пакуль яблык упадзе на зямлю
І пабіўшы свой ружовы бок
Стане абыякавым да свайго я
А пакуль у яблыку жыве спакуса
Як каралеўна ў залатой вежы
Яблык падабаецца ўсім
І я ідучы праз сад
Бачу спакусны яблык
Спрабую яго дастаць
І не дастаю
І яблык гайдаючыся на галіне
Будзе свяціцца радасцю
Пакуль будзе помніць
Сваё я

## ЧОВЕН

Човен гайдаецца на хвалях
Пазвоньваючы іржавым ланцугом
Які яго не пускае аддацца рацэ
І плыць у незваротнасць
Човен гэта шкарлупіна арэха
Якія растуць у краіне
Дзе ніколі ніхто не быў
Човен гэта труна
У якой пахаваны
Самотныя і вясёлыя дні
Рыбаловаў і вандроўнікаў
І падскоквае човен на хвалях

Спрабуючы ўбачыць чалавека
Але начамі прыходзіць Харон
І перавозіць на другі бераг цені
А пад раніцу зноў прывязвае човен
У цень якога ў спякотны дзень
Хаваюцца русалкі
І спяваюць сумныя песні
І злуецца Вадзяны
І колькі ўжо дзён збіраецца
Даць вольную чаўну
Але ўсё ніяк не наважыцца
Бо любіць слухаць звон ланцуга
Які напамінае яму звон грошай
Якія калісьці ён меў

## ГАРШЧОК

На прыпеку стаіць гаршчок
Гаршчок пасыльны
Яго напаўняюць і асцярожна
Як бомбу
Двума жалезнымі пальцамі
Уносяць у пекла агню
І ў гаршку ўсё закіпае
Ён злуецца і радуецца
І ад гарачыні аж вар'яцее
І вогнікі аблізваюць з яго пену
І ў рэшце рэшт у гаршку ўсё супакойваецца
Супакойваецца і сам агонь
І гаршчок стаіць сярод вугалёў
Як пан сярод золата
І прыходзіць час і дастаюць гаршчок з печы
І забіраюць з яго ўсё
З чым яго пасылалі ў пекла агню
І мыюць яго і шкрабуць
Каб зноў паставіць на прыпек
І стаіць ён на прыпеку чорны як галавешка
І слухае як з хаты па дымаходзе
Уцякае ў неба чад
І ўяўляе сябе гаршчок звонам

Якому крыху не пашанцавала

## ПЛОТ

Плот гэта ахоўнік
Яго паставілі і ён стаіць
І кожны хто праходзіць міма
Стараецца зазірнуць за плот
Бо плот спакушае
І чым большы плот
Тым большая спакуса
Плот гэта драбіна
Па якой спускаюцца ва ўласнае я
Абмяжоўваючы сябе ў прасторы
Але ў плоце заўсёды ёсць вароты
Як зварот у свет
Дзе ёсць дарога
Якая ўцякае ад платоў
За якія хаваемся мы
І выходзячы з-за плота
Мы імкнемся назад
Плот гэта ашыйнік
На шыі майго жыцця

## СЯЧКАРНЯ

На ўтравелым двары сячкарня
Не хаваецца пад страху
Сама наводзіць страх
І кола сячкарні коціцца
Паміж мной і табою
І застаецца на месцы
Нібы ўрослае ў зямлю
І нажы іржавеюць
Калі няма саломы
На ўтравелым двары сячкарня
Нібы дваццатае стагоддзе

## ПАДКОВА

На дзвярах пустой канюшні
Дзе даўно жыве рэха
На іржавым цвіку
Як на сваім шчасці
Вісіць іржавая падкова
І па начах ёй сніцца брукаванка
Як Млечны Шлях у невядомасць
І галасы шчаслівыя людзей
Што едуць на кірмаш
Нібыта цыганы ў рай
Падкове сніцца мяккі цёплы туман
За якім усё прапала
Як і сам туман пасля ўсходу сонца
І ляжала падкова ля кузні
Як згубленае шчасце
Як непатрэбнае мінулае
І знайшлі падкову хлапчукі
І прыбілі яе на дзверы канюшні
Прыбілі як пакаралі
І паляцела б яна ў неба
І ўпала б і прапала б у траве
Але яе трымае цвік
Як галодны сабака костку
І я праходзячы ля канюшні
І бачачы падкову
Успамінаю і кузню і коней
І брукаванку і свайго дзеда
І забраў бы я падкову дахаты
Але няма ў мяне той хаты
Адкуль можна ехаць па брукаванцы
Праз цёплы туман на кірмаш
І вісіць на дзвярах падкова
Як апушчаныя крылы
Распятага анёла

## СОН

і быў напачатку сон

і мы ў гэтым сне былі
як матылі ў кокане

сон гэта райскае возера
у якім мы плаваем
не разумеючы
што патанулі

сон гэта туман
праз які мы праходзім
зажмурыўшыся

сон гэта нара
у якую хаваецца маё я
ад мяне самога

сон гэта павуцінка
за якую трымаецца душа
у час сваіх начных вандровак

сон гэта зацьменне
майго сонца

сон гэта пацалунак смерці
за тое што мы ёсць

і мне сніцца сон
і я люблю гэты сон
бо ён не паўторыцца

## ПАРОГ

Парог першым сустракае
І апошнім у хаце развітваецца
Парог гэта мяжа
Якую ахоўваюць дзверы
Смела пераходзяць парог
Толькі тыя каго помніць парог
І хто парог помніць
Парог гэта бераг

Аб які разбіваюцца
Мае трывогі за бацькоў
І я пераступаючы парог
Вяртаюся ў сваё Запарожжа
Каб пісаць табе лісты
Парог самотны
Ён помніць столькі сустрэч і расстанняў
Што лежачы на шляху з хаты
Ён часам гатоў стаць сцяной
Каб не выпусціць гаспадара-вандроўніка
Які даўно абівае чужыя парогі

## ЛІХТАР

На бэльцы ў вараўні
Вісіць ліхтар
Павукі аплялі яго павутой
Думаючы што ліхтар
Гэта сонца
Якое цяпер аплеценае павутой
Належыць толькі ім
А ліхтар чакае свайго часу
Калі гаспадар здыме яго з цвіка
Пратрэ шкло і нальe газы
Запаліць кнот
І знікне з вараўні цемра
І з'явяцца ў вараўні цені
Але гаспадар заходзячы ў вараўню
Нават і не глядзіць на ліхтар
І толькі ўляцелыя мухі
З крыкам «мой!»
Кідаюцца да ліхтара
Ліхтар злуецца але маўчыць
Верачы што прыйдзе дзень
З'іржавее цвік у бэльцы
І зваліцца ліхтар на зямлю
І разаб'ецца
І зойдзе гаспадар у вараўню
І ўбачыць разбіты ліхтар
І заплача

Але цвік не іржавее
І вісіць ліхтар забытым палонным сонцам
І радуюцца павукі
Што ліхтар цяпер належыць толькі ім

## КАРАНІ

Карані як вужакі
Звязаныя ў адно цэлае хвастамі
Распаўзаюцца ў падземным царстве
Ва ўсе бакі свету
У пошуках сэнсу жыцця
І яны нястомныя
Прагныя і ўпартыя
Іх вымываюць рэкі
Іх разразаюць плугі і лапаты
А яны паблісквaючы на сонцы
Сваімі гнуткімі целамі
Зноў імкнуцца ў цемру зямлі
І чым глыбей распаўзаюцца карані
Тым вышэй дрэва падымае крону
І вецер не паваліць дрэва
І толькі маланка
Закахаўшыся ў дрэва
Загубіць дрэва
Але не карані
Якія маланкай падземнага царства
Дадуць святло новаму дрэву

## СЯКЕРА

На вастрыі сякеры
Жыве смерць
І чуецца мне голас дзеда
Не чапай сякеру пасячэшся
Але я сякеру бяру
Бо даўно няма дзеда
І слухаецца мяне сякера
І разлятаюцца як восы шчэпкі

І падае сухое дрэва
І сякера ў маіх руках цяжэе
І кладу я сякеру
І кажу свайму сыну
Не чапай сякеру пасячэшся
І ляжыць сякера на дрывотні
Як вой на касцях ворага
Святкуючы сваю перамогу
І ляжыць сякера да пары да часу
І спяць у ёй гром і маланка
І хто возьме сякеру
Той і будзе гаспадаром

## ГАЛАВЕШКА

Ад белай бярозы
Пасля чырвонага агню
Засталася чорная галавешка
І ляжыць галавешка сярод выгарыны
І баіцца яе трава
Помнячы што ёсць гаспадар агонь
І поўзаюць па ёй мурашкі
Гадаючы адкуль узялася галавешка
Ці гэта тое што засталося ад маланкі
Якая звалілася з неба
Ці гэта што іншае
Такое чорнае і мёртвае
І прыйдзе час і дождж
Абмые галавешку
І прыйдзе час і трава
Пакрые галавешку
І прыйдзе час і зямля
Забярэ галавешку
А пакуль ляжыць яна
Сярод спалоханай травы
На выгарыне як на падсцілцы
Чорны сабака
Якога пакінуў гаспадар
Загадаўшы чакаць
І абяцаўшы вярнуцца

А ён яшчэ вернецца

## МОСТ

На мост праз раку прыходзяць
Каб убачыць як цячэ час
Каб спазнаць незваротнасць і немінучасць
На мост праз раку прыходзяць
Каб утапіцца
Мост трымае рачныя берагі
Нібыта краі зямной расколіны
Не даючы ёй разрасціся
І раздзяліць мяне з табой
Мост злучае
Яго берагуць каб вярнуцца
Яго паляць каб застацца
Мост заўсёды самотны
Але ён весела рыпіць
Калі па ім едуць дамоў
Мост помніць усё і ўсіх
І яму не трэба напамінаць
Што на тым беразе маё дзяцінства
І колькі б я ні ішоў па мосце
Я ніколі не траплю назад
Мост кальцавая рыфма
Паміж двума радкамі берагоў
Якія створаны крыніцай
Якія нам чытаць і не перачытаць
Губляючыся ў прозе жыцця

## СВЕЧКА

У свечкі мяккі характар
І светлая душа
Свечка ахвяруе сабой
І згараючы плача
Ад радасці і суму
Свечка гэта нож
Які лязом агню

Разразае цемру
Вызваляючы з яе мой пакой
У свечкі кароткае жыццё
Але яго хапае
Каб я палюбіў свечку

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год

© PDF: Камунікат.org, 2011 год

# ЗМЕСТ

Беларускае мора
**1**
Полацкая балада
Балада Мірскага замка
Балада кнігі
Балада Крэўскага замка
Балада вяртаньня Багдановіча
Балада Уладзімера Караткевіча
Балада Максіма Танка
Магчымая балада XXI стагодзьдзя
Балада паланэза Агінскага
Балада Васіля Быкава
Балада пра царкву і ваўка
Балада чаканьня
Балада першага беларускага вандроўніка
Балада пошукаў свайго сьвету
Балада замка ў Лоску
Балада першага сьнегу
Балада XX стагодзьдзя
Балада дваіх
Балада ўцёкаў з карчмы
Балада разьвітаньня
Балада вяртаньня
Балада замерзлай рэчкі
Пірацкая балада
Балада Яўгеніі Янішчыц
Балада Васіля Сахарчука
Балада белых птушак

**2**
«Нясьмелыя цёплыя дні...»
«Мы яшчэ маладыя з табой...»
«Будзе сьнег. Будзе дождж. Будзем мы...»
Сьпёка
«Зноў за вокнамі ноч, як бяздоньне...»
«Я люблю сяброў, што ўмеюць здрадзіць...»
«Пад тваімі вокнамі рабіна...»
«Шчасьлівыя людзі, што ведаюць мала...»
«Прыйшлі сябры і мне сказалі, што мяне...»
«Беларусь ня птушка, не шыпшына...»
«Мы затоплены часам, нібыта вадой...»
«Песьні слухаю і піва п'ю...»
«Зноў далёка ля Чорнага мора...»
«Згарыць папера, попел застанецца...»
«Я ізноўку адзін, як нявольнік...»
«Праз ноч, як праз далеч, імчыцца цягнік...»
«Хутка сьнегам сады замятуцца...»
«...Дрэвы ператворацца ў вялікіх птушак...»

«Ты далёка, як тое, што будзе праз год…»
«Неба над намі нібыта вада…»
Гісторыя аднаго каханьня
«Яшчэ ўсё можна нам з табой зьмяніць…»
«Гэты дзень праляцеў, як страла…»
«Вось і ўсё… Цябе са мной няма…»
«Гады прайшлі, нібы прайшлі дажджы…»
«…А шэры горад змыецца вадой…»
«Гэты сьвет прыдумалі ня мы…»
«На паперы белай белая зіма…»
«Вярнуўся дадому, нібыта прачнуўся…»
«Сябе прап'ў нібы сябе забіў…»
«У гэтым сьвеце немагчыма жыць…»
«Не хадзі ты ў карчму, не глядзі ты ў вакно…»
«Аб сьцяну залатую бяроз…»
«…А сёньня канчаецца нашае лета…»
Выкраданьне Беларусі
У сьвяты вечар
«Рана ці позна зіма праміне…»
«Сёньня шчэ восень, а заўтра – зіма…»
«Ты ведаеш даўно, што мы памром…»
«Начныя вуліцы залітыя сьвятлом…»
«Калі зноў пачынаюцца дажджы…»
«…У зіме адзінокія мы…»
«Ад нас застануцца ня нашы пасады…»
Лета прайшло…
«…І трэснула неба, як шкло на іконе…»
«Нарэшце дачакаліся цяпла…»
У Вечным горадзе
Шлях Максіма Гарэцкага
Чорная постаць
«Ад'язджаем, быццам паміраем…»
«А на праспэкце кветкі і плакаты…»
«Чырвоную гліну – застылую кроў…»
Казка пра кавярню сьмерці
«Яшчэ будуць высокія мяккія травы…»
«Зноў бяз вас не знаходжу спакою…»
Ружа
«Восень. Самотная восень Айчыны…»
Адзінокі
Сад вечнай самоты
«Вячэрняю смугой затоплены прасторы…»
«У далечы ад роднае Гарыні…»
«Спачатку музыка была…»
«Каркаюць абрыдліва вароны…»
«А за акном счарнелыя галіны…»
«Вось і лісьце апала на бруд і калюгі…»
«На шэрым сьнезе чорныя гракі…»
«Вецер згінае высокія дрэвы…»

**З**
Неба
Вада
Дрэва
Зорка
Цень
Калодзеж
Шкло
Дзень
Гліна
Валун
Туман
Трава
Першы тыдзень безь цябе
Кола
Яблык
Човен
Гаршчок
Плот
Сячкарня
Падкова
Калюга
Сон
Парог
Ліхтар
Карані
Сякера
Галавешка
Мост
Сьвечка

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год

© PDF: Камунікат.org, 2011 год